Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

ЛЮТЫ 13 1934 г. АЎТОРАК № 36 (4869)

Год выдання XVII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся

СЁННЯ Ў НУМАРЫ

Даклад тав. Л. М. КАГАНОВІЧА па арганізацыйных пытаннях

(ПАРТЫЙНАЕ І СОВЕЦКАЕ БУДАЎНІЦТВА)—НА 3 і 4 стар.

XVII з'езд ВКП(б)

АРГАНІЗАЦЫЙНЫЯ ПЫТАННІ

(Партыйнае і совецкае будаўніцтва)

Рэзалюцыя XVII з'езда ВКП(б) па дакладу тав. Л. КАГАНОВІЧА

(ПРЫНЯТА АДНАГАЛОСНА)

КАНЕЦ. ПАЧАТАК ГЛЯДЗІ Ў № 35.

14. Забяспечыць правядзенне на прыкладу вугальнай прамысловасці і чыгуначнага транспарта прасоўкі інжынерна-тэхнічных кадраў з канцыляры па вытворчасць за ўсіх галінах народнай гаспадаркі і дзяржаўнага кіраўніцтва.

15. Перабудаваць тарыфы аплаты працы такім чынам, каб стымулёраваць работу непасрэдна ў цэху, на ўчастку, у вытворчасці.

Забяспечыць усім чесным і вядомым інжынерна-тэхнічным работнікам, незалежна ад партыйнасці, магчымасць самага шырокага прасоўвання на адказныя камандныя пасты ў прамысловасці, сельскай гаспадарцы і інш. Арганізаваць абавязковую праверку тэхнічнай і дзелавой кваліфікацыі работнікаў праз атэстацыйна-экзаменацыйныя камісіі незалежна ад партыйнасці.

Абавязаць кіраўнікоў гаспадарчых органаў і прадпрыемстваў аўладаць асновамі тэхнікі сваёй справы, распрацаваць па ўсякай галіне прамысловасці і народнай гаспадаркі тэхнічны мінімум, які належыць абавязковаму вывучэнню ў поўны мінімальны тэрмін усім кіруючымі работнікамі.

Аб рабоце мясцовых советаў, професіянальных і комсамольскіх арганізацый па паляпшэнню дзяржаўнага і гаспадарчага апарата

16. Арганізаваць масавы кантроль работы органаў кіравання і паставіць пад жорсткую крытыку ўсе бюракратычныя ізвы і недахопы апарата.

Распырыць сетку секцый советаў і дэпутацкіх груп на прадпрыемствах, у сёлах, а ў вялікіх гарадах арганізаваць падраённыя і участковыя групы дэпутатаў советаў, пры гэтым асаблівую ўвагу звярнуць на ўцягненне ў работу советаў і іх секцый жанчын-актывістак, работніц і калгасніц.

17. Перадаць прафсаюзам усе правы ізвых органаў РСІ на прадпрыемствах і кіраўніцтва кантрольнымі органамі пры ОРС'ах, ЗРК, райспажыўтаварыствах, горспажыўтаварыствах.

Разгарнуць і якасна падняць апраўдаўшае сябе шэфства прадпрыемстваў над дзяржустановамі і сацыялістычную сумяшчальнасць работы на вытворчасці з работай у дзяржустановах.

Аднавіць апраўдаўшую сябе практыку арганізацыі «лёгкай кавалерыі» комсамола, пасяхова ўскрываўшай бюракратычныя недахопы апарата. Падняць якасць работы ячэек комсамола ў дзяржустановах па паляпшэнню дзяржапарата.

III. Арганізацыйныя мерапрыемствы ў галіне ўзмацнення партыйна-совецкага кантроля

18. У мэтах узмацнення кантролю над выкананнем рашэнняў урада і ўмацавання совецкай дысцыпліны прызнаць неабходным правядзенне наступных арганізацыйных мерапрыемстваў:

а) перафармаваць камісію выканання пры СНК Саюза ССР у нанячаемую з'ездам партыі і зацвярджаемую ЦВК і СНК Саюза ССР камісію совецкага кантроля пры СНК Саюза ССР са сваім апаратам у цэнтры і пастаяннымі прадстаўнікамі ў рэспубліках, краях, абласцях, назначаемымі і адклікаемымі камісіяй совецкага кантроля;

б) наркамат РСІ, ужо адыграўшы сваю станоўчую ролю, скасаваць і перадаць яго апарат камісіі совецкага кантроля СНК Саюза ССР.

в) Кіраўніком камісіі совецкага кантроля прызначыць аднаго з намеснікаў старшыні СНК Саюза ССР.

19. У мэтах узмацнення кантролю над выкананнем пастаноў партыі і ЦК ВКП(б), умацавання партыйнай дысцыпліны і барацьбы з парушэннямі партыйнай этыкі, лічыць неабходным правядзенне наступных арганізацыйных мерапрыемстваў:

а) ператварыць Цэнтральную Кантрольную Камісію ў выбіраемую з'ездам партыі Камісію Партыйнага Кантроля пры ЦК ВКП(б) са сваім апаратам у цэнтры і пастаяннымі прадстаўнікамі ў рэспубліках, краях, абласцях, назначаемымі і адклікаемымі Камісіяй Партыйнага Кантроля пры ЦК ВКП(б);

б) апарат Цэнтральнай Кантрольнай Камісіі перадаць Камісіі Партыйнага Кантроля пры ЦК ВКП(б);

в) кіраўніком Камісіі Партыйнага Кантроля пазначыць аднаго з сакратароў ЦК ВКП(б).

***

XVII з'езд партыі абавязвае ўсіх комуністаў; дзе-б яны ні працавалі, забяспечыць выкананне ўказаных у данай пастанове мерапрыемстваў у справе арганізацыйнай перабудовы і паляпшэння работы ўсіх органаў пролетарскай дыктатуры.

З'езд партыі папярэджвае ўсіх работнікаў партыйных, совецкіх, профсаюзных, комсамольскіх і інш. арганізацый, у першую чаргу комуністаў, што, заахвочваючы лепшых работнікаў, ЦК партыі і совецкія кіруючыя органы будуць змагацца з усякіх пастоў, ставіць на ніжэйшыя пасты і строга спагнаць з усіх работнікаў, не гледзячы на асобы, якія будуць парушаць партыйную і совецкую дысцыпліну.

XVII з'езд партыі ўпэўнен, што члены нашай партыі акажуцца на вышыні сваіх задач, дапамогуць сваёй актыўнасцю партыі і ўраду ачысціць апараты пролетарскай дыктатуры ад бюракратычных недахопаў, умацуюць дыктатуру пролетарыята, падымуць яшчэ больш кіруючую ролю партыі і забяспечаць краіне поўную перамогу другой пяцігодкі.

У камісіі партыйнага кантроля

Старшынёй камісіі выбран тав. Л. М. КАГАНОВІЧ

10-га лютага адбылося першае пасяджэнне камісіі партыйнага кантроля пры ЦК ВКП(б), выбранай XVII з'ездам ВКП(б).

Для кіраўніцтва бягучай работай камісіі выбрана бюро камісіі ў складзе тт. **Кагановіча, Ежова, Шкіратава, Яраслаўскага, Акулава, Булатава і Петэрса.**

Старшынёй камісіі выбран т. Кагановіч Л. М., намеснікам старшыні т. **Ежоў Н. І.**

Для разгляду спраў, звязаных з парушэннем партыйнай этыкі і дысцыпліны, створана **партколегія** ў складзе тт. **Шкіратава** (сакратар), **Яраслаўскага** і **Караваева.**

Камісія даручыла бюро выпрацаваць палажэнне аб рабоце камісіі і партколегіі, а таксама намеціць план бліжэйшых работ камісіі партыйнага кантроля.

У камісіі совецкага кантроля

Старшынёй камісіі выбран тав. КУЙБЫШЭЎ

11 лютага а 1 гадзіне дня ў зале пасяджэнняў Соўнаркома Саюза адбылося першае пасяджэнне камісіі совецкага кантроля.

Камісіяй аднагалосна выбраны: старшынёй тав. **Куйбышэў**, намеснікам старшыні тав. **Акціпаў** і членамі бюро тт. **Рэйзенман, Ломаў, Ціхан, Масквін, Ульянава, Беленькі, Землячка, Дзяч і Гайстэр.**

Выбранаму бюро даручана да наступнага пасяджэння камісіі (15 лютага) распрацаваць праект палажэння аб камісіі совецкага кантроля.

СТАТУТ УСЕСАЮЗНАЙ КОМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ (большэвікоў)

СЕКЦЫЯ КОМУНІСТЫЧНАГА ІНТЭРНАЦЫЯНАЛА

(Прынят аднагалосна XVII з'ездам ВКП(б)

Усесаюзная Комуністычная партыя (большэвікоў), якая з'яўляецца секцыяй Комуністычнага Інтэрнацыянала, ёсць перадавы, арганізаваны атрад пролетарыята Саюза ССР, вышэйшая форма яго класавай арганізацыі.

Партыя ажыццяўляе кіраўніцтва пролетарыятам, працоўным сялянствам і ўсімі працоўнымі масамі ў барацьбе за дыктатуру пролетарыята, за перамогу сацыялізма.

Партыя кіруе ўсімі органамі пролетарскай дыктатуры і забяспечвае пасяховае набудаванне сацыялістычнага грамадства.

Партыя з'яўляецца адзінай, баявой арганізацыяй, звязанай свядомай, жалезнай пролетарскай дысцыплінай. Партыя моцна сваёй згуртаванасцю, адзінствам волі і адзінствам дзеянняў, несумяшальных з адступленнем ад праграмы, парушэннем партыйнай дысцыпліны і з фракцыйнымі групіроўкамі ўнутры партыі.

Партыя патрабуе ад сваіх членаў актыўнай і самаадданай работы па ажыццяўленню праграмы і статута партыі, выкананню ўсіх пастаноў партыі і яе органаў, забяспечэнню адзінства радоў партыі і ўмацаванню брацкіх, інтэрнацыянальных адносін як паміж працоўнымі нацыянальнасцяй СССР, так і з пролетарыямі ўсіх краін свету.

I. АБ ЧЛЕНАХ ПАРТЫІ І ІХ АБАВЯЗКАХ

1. Членам партыі лічыцца ўсякі, хто прызнае праграму партыі, працуе ў адной з яе арганізацый, падпарадкоўваецца пастановам партыі і ўплачвае членскія ўзносы.

2. Член партыі абавязан:

а) захоўваць найстражэйшую партыйную дысцыпліну, прымаць актыўны ўдзел у палітычным жыцці партыі і краіны, праводзіць на практыцы палітыку партыі і рашэнні партыйных органаў;

б) пастомна працаваць над павышэннем сваёй ідэйнай узброенасці, над усваеннем асноў марксізма-ленінізма, важнейшых палітычных і арганізацыйных рашэнняў партыі, растлумачваць іх беспартыйным масам;

в) як член кіруючай партыі ў совецкай дзяржаве, — быць узорам захавання працоўнай і дзяржаўнай дысцыпліны, авалодваць тэхнікай сваёй справы, безупынна паляпшаючы сваю вытворчую, дзелавую кваліфікацыю.

3. Прыём у члены партыі праводзіцца выключна ў індывідуальным парадку. Новыя члены прымаюцца з ліку кандыдатаў, прайшоўшых устаноўлены кандыдацкі стаж, школу палітычнай граматы і ўсвоіўшых праграму і статут партыі. У члены партыі прымаюцца рабочыя, калгаснікі, чырвонаармейцы, вучні і служачыя, праявіўшыя сябе на рабоце ў групах спачуваючых, у советах, профсаюзах, комсамоле, кааперацыі, дэлегацкіх сходах, пасля атрымання водзыву той арганізацыі, дзе ўступаючы працаваў ці працуе.

Парадак прыёму ў члены партыі з кандыдатаў наступны:

а) Устанаўліваюцца чатыры катэгорыі:

1) прамысловыя рабочыя з вытворчым стажам не менш 5 год;

2) прамысловыя рабочыя з вытворчым стажам менш 5 год, сельска-гаспадарчыя рабочыя, чырвонаармейцы з рабочых і калгаснікаў і інжынерна-тэхнічныя работнікі, якія працуюць непасрэдна ў цэху ці на ўчастку; 3) калгаснікі, члены саматужна-прамысловых арцеляй і пастаўнікі пачатковай школы; 4) астатнія служачыя.

б) Для прыёму ў партыю асобы першай катэгорыі прадстаўляюць тры рэкамендацыі членаў партыі з пяцігадовым партыйным стажам; асобы другой катэгорыі — пяць рэкамендацый членаў партыі з пяцігадовым партыйным стажам; асобы трэцяй катэгорыі — пяць рэкамендацый членаў партыі з пяцігадовым партыйным стажам і рэкамендацыю прадстаўніка палітаддзела МТС або райкома; асобы чацвертай катэгорыі — пяць рэкамендацый членаў партыі з дзесяцігадовым партстажам.

ЗАЎВАГА: Пры прыёме ў члены партыі з комсамола па ўсіх катэгорыях рэкамендацыя раённага камітэта ВЛКСМ прыраўноўваецца да рэкамендацыі двух членаў партыі.

в) Выхадцы з другіх партый прымаюцца ў выключных выпадках па рэкамендацыі пяці членаў партыі: трох з 10-гадовым партстажам і двух з дарэволюцыйным партстажам, не інакш як праз вытворчую пярвічную арганізацыю, з абавязковым зацвярджэннем ЦК ВКП(б), незалежна ад сацыяльнага становішча прымаемага.

ЗАЎВАГА: ЦК можа прадастаўляць права канчатковага зацвярджэння ў члены партыі выхадцаў з другіх партый паасобным краявым і абласным партыйным камітэтам і ЦК нацыянальных компартый.

г) Праверка рэкамендацый прадпяствуе прыёму і ляжыць на абавязку мясцовага партыйнага камітэта.

д) Пытанне аб прыёме ў партыю спачатку разглядаецца пярвічнай партыйнай арганізацыяй, выражаецца агульным сходам арганізацыі і ўступае ў сілу пасля зацвярджэння для першай і другой катэгорыі райкомам або гаркомам, для трэцяй і чацвертай катэгорыі—абкомам, крайкомам або ЦК нацыянальнай компартыі.

е) Моладзь да 20 год уключна ўступае ў партыю толькі праз ЛКСМ.

4. Рэкамендуючыя нясуць за рэкамендуемых адказнасць, падпадаючы ў выпадку неўгрунтаваных рэкамендацый партыйным спагнаннем аж да выключэння з партыі.

5. Партстаж прымаемых з кандыдатаў у члены партыі вылічваецца з дня прыняцця агульным сходам адпаведнай пярвічнай партыйнай арганізацыяй пастановы аб зацвярджэнні данага таварыша ў члены партыі.

6. Усякі член адной арганізацыі пры пераездзе ў раён работы другой арганізацыі залічваецца апошняй у лік яе членаў.

ЗАЎВАГА: Пераезд членаў партыі з адной арганізацыі ў другую адбываецца згодна правіл, устаноўленых ЦК ВКП(б).

7. Члены партыі і кандыдаты, на працягу трох месяцаў не заплаціўшыя без уважлівых прычын членскіх узносаў, лічацца выбыўшымі з партыі, аб чым даводзіцца да ведама агульнага схода членаў пярвічнай арганізацыі.

8. Пытанне аб выключэнні каго-небудзь з партыі вырашаецца агульным сходам той арганізацыі, членам якой даная асоба з'яўляецца, і зацвярджаецца для першай і другой катэгорый абласным ці краявым камітэтам, для трэцяй і чацвертай катэгорый—раённым ці гарадскім камітэтам, прычым з дня выключэння агульным сходам парт арганізацыі або партыйным камітэтам даная асоба адстраняецца ад партыйнай работы. Аб выключаных членах партыі публікуецца ў партыйным друку з указаннем прычыны выключэння.

9. Перыядычнымі рашэннямі ЦК ВКП(б) праводзяцца чысткі для сістэматычнага ачышчэння партыі ад:

класава-чужых і варожых элементаў;

двурушнікаў, ашукваючых партыю і захоўваючых ад яе свае сапраўдныя погляды і зрываючых палітыку партыі;

адкрытых і скрытых парушальнікаў жалезнай дысцыпліны партыі і дзяржавы;

перараджэнцаў, што зрастаюцца з буржуазнымі элементамі;

кар'ерыстаў, шкурнікаў і абюракраціўшыхся элементаў;

маральна разлажыўшыхся, раніючых сваімі непрыстойнымі паводзінамі годнасць партыі, пэцкаючых сцяг партыі;

пасіўных, не выконваючых абавязкаў членаў партыі і не ўсвоіўшых праграмы, статута і важнейшых рашэнняў партыі.

II. АБ КАНДЫДАТАХ У ЧЛЕНЫ ПАРТЫІ

10. Усе асобы, жадаючыя ўступіць у партыю, праходзяць кандыдацкі стаж, які мае на мэце грунтоўнае азнаямленне з праграмай, статутам, тактыкай партыі і праверку асабістых якасцяй кандыдатаў.

11. Парадак прыёму ў кандыдаты (падзел на катэгорыі, характар рэкамендацый і іх праверка, рашэнне арганізацыі аб прыёме і зацвярджэнне партыкомам) зусім тойжа, што пры прыёме ў члены партыі.

12. Кандыдацкі стаж устанаўліваецца: для першай катэгорыі — 1 год, для другой, трэцяй і чацвертай катэгорый — 2 гады.

ЗАЎВАГА:

Выхадцы з другіх партый, незалежна ад іх сацыяльнага становішча, праходзяць трохгадовы кандыдацкі стаж.

13. Кандыдаты ў члены партыі прымаюць удзел на сходах той арганізацыі, у якой яны знаходзяцца, з правам дарадчага голаса.

14. Кандыдаты плацяць звычайны членскі ўзнос у кожу мясцовага партыйнага камітэта.

III. АБ ГРУПАХ СПАЧУВАЮЧЫХ

15. Для арганізацыі вакол ВКП(б) найбольш блізкіх да партыі беспартыйных актывістаў, па заказўшых на справе на вытворчасці сваю адданасць партыі, але яшчэ не прыхтаваных да ўступлення ў партыю стварэнне пры пярвічных партыйных арганізацыях групы спачуваючых ВКП(б), якія бязумоўна падпарадкоўваюцца ўсім рашэнням партыйных органаў.

16. Прыём у групы спачуваючых праводзіцца рашэннямі бюро ячэйкі, устаноўчых і інш. партыйных камітэтаў, палітаддзелаў МТС, саўгасаў і чыгуначнага транспарта з рэкамендацыяй двух членаў партыі.

17. Арганізаваныя ў групы спачуваючых ВКП(б) абавязаны наведваць усе адкрытыя партыйныя сходы, на якіх яны карыстаюцца правам дарадчага голаса, актывна змагацца за выкананне пастаноў партыі і ўрада, сістэматычна працаваць пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый над павышэннем свайго грамадзка-палітычнага ўзроўню.

IV. АБ АРГАНІЗАЦЫЙНАЙ ПАБУДОВЕ ПАРТЫІ

18. Кіруючым прынцыпам арганізацыйнай пабудовы партыі з'яўляецца дэмакратычны цэнтралізм, які азначае:

а) выбарнасць усіх кіруючых органаў партыі зверху данізу;

б) перыядычную справаздачнасць партыйных органаў перад сваімі партыйнымі арганізацыямі;

в) суровую партыйную дысцыпліну і падпарадкаванне меншасці большасці;

г) безумоўную абавязковасць рашэнняў вышэйшых органаў для ніжэйшых і для ўсіх членаў партыі.

19. Партыя будуецца на асновах дэмакратычнага цэнтралізма па тэрытарыяльна - вытворчаму прынцыпу: арганізацыя, якая абслугоўвае які-небудзь раён, лічыцца вышэйшай у адносінах да ўсіх арганізацый, абслугоўваючых частку даннага раёна, ці арганізацыя, якая абслугоўвае цэлую галіну вытворчасці або кіраўніцтва, лічыцца вышэйшай у адносінах да ўсіх арганізацый, абслугоўваючых часткі данай галіны.

20. Усе партыйныя арганізацыі аўтаномны ў рашэнні мясцовых пытанняў, паколькі гэтыя рашэнні не супярэчаць рашэнням партыі.

21. Вышэйшым кіруючым органам кожнай арганізацыі з'яўляецца агульны сход, канферэнцыя або з'езд.

22. Агульны сход, канферэнцыя або з'езд выбіраюць камітэт, які з'яўляецца іх выканаўчым органам і кіруе ўсёй бягучай работай арганізацыі.

23. Схема арганізацыі партыі заступная:

а) тэрыторыя СССР — усесаюзны з'езд — ЦК ВКП(б);

б) вобласці, краі, рэспублікі — абласныя, краявыя канферэнцыі, з'езды нацкомпартый — абкомы, крайкомы, ЦК нацкомпартый;

в) гарады, раёны — гарадскія, раённыя канферэнцыі — гарадскія, раённыя камітэты;

г) прадпрыемствы, населішчы, калгасы, МТС, чырвонаармейскія часці, установы — агульныя сходы, канферэнцыі пярвічных партыйных арганізацый, пярвічныя партыйныя камітэты (зацпартсы, фабпартсы, партбюро чырвонаармейскай часці і інш.).

24. Парадак падначалення, справаздачнасці, праходжэння і абмеркавання партыйных пастаноў (ад вышэйшай інстанцыі да тэмяшняй): усесаюзны з'езд, ЦК ВКП(б), абласная-краявая канферэнцыя, канферэнцыя або з'езд нацкомпартый, абласны-краявы камітэт, ЦК нацкомпартый, гарадская-раённая канферэнцыя, гарадскі-раённы камітэт і інш.

25. Для практычнай работы па ажыццяўленню партыйных дырэктыў і пастаноў (і праверкі іх выканання совецка-гаспадарчымі органамі і іншымі партарганізацыямі) у абкомах, крайкомах, ЦК нацкомпартый і ЦБ ВКП(б) ствараюцца цэласныя вытворча-галінныя аддзелы.

У ЦК ВКП(б):

а) сельска-гаспадарчы, б) прамыслова-транспартны, в) совецка-гандлёвы, г) культуры і прапаганды ленінізма, д) кіруючых партарганаў (гарадскіх і раённых) і асобы сектар.

У кожным вытворча-галінным аддзеле сканцэнтроўваецца ўся работа ў цэлым па данай галіне: арганізацыя, размеркаванне і падрыхтоўка кадраў, агітмасработа, вытворчая прапаганда, нагляд за выкананнем партыйных рашэнняў адпаведнымі совецка-гаспадарчымі органамі і партыйнымі арганізацыямі.

26. Кожная арганізацыя партыі пасля канчатковага яе зацвярджэння мае права набыць сваю пячатку, але не інакш як з санкцыі адпаведнай вышэйшай партыйнай арганізацыі.

V. АБ ЦЭНТРАЛЬНЫХ АРГАНІЗАЦЫЯХ ПАРТЫІ

27. Вярхоўным органам партыі з'яўляецца **з'езд.** Чарговыя з'езды склікаюцца не радзей аднаго разу ў тры гады. Надзвычайныя з'езды склікаюцца Цэнтральным Камітэтам па ўласнай ініцыятыве або па патрабаванню не менш адной трэці агульнага ліку членаў, прадстаўленых на апошнім партыйным з'езде. Скліканне партыйнага з'езда і парадак дня аб'яўляюцца не пазней як за паўтара месяца да з'езда. Надзвычайныя з'езды склікаюцца ў двухмесячны тэрмін.

З'езд лічыцца сапраўдным, калі на ім прадстаўлена не менш палоўны ўсіх членаў партыі, прадстаўленых на апошнім чарговым з'ездзе.

Нормы прадстаўніцтва на з'езд партыі ўстанаўліваюцца Цэнтральным Камітэтам.

28. У выпадку несклікання Цэнтральным Камітэтам надзвычайнага з'езда ва ўказаны ў пункце 27 тэрмін, арганізацыі, патрабаваўшыя склікання надзвычайнага з'езда, маюць права стварыць арганізацыйны камітэт, які карыстаецца правамі Цэнтральнага Камітэта па скліканню надзвычайнага з'езда.

29. З'езд:

а) заслухоўвае і зацвярджае справаздачы Цэнтральнага Камітэта, Камісіі Партыйнага Кантроля, Цэнтральнай Рэвізійнай Камісіі і іншых цэнтральных арганізацый;

б) пераглядае і змяняе праграму і статут партыі;

в) вызначае тактычную лінію партыі па асноўных пытаннях бягучай палітыкі;

г) выбірае Цэнтральны Камітэт, Камісію Партыйнага Кантролю, Цэнтральную Рэвізійную Камісію і памячае склад камісіі совецкага кантроля для прадстаўлення на зацвярджэння ЦВК і СНК Саюза ССР.

30. Цэнтральны Камітэт і іншыя цэнтральныя арганізацыі выбіраюцца ў складзе, устанаўліваемым з'ездам. У выпадку выбыцця членаў Цэнтральнага Камітэта, склад яго папаўняецца з ліку выбраных з'ездам кандыдатаў у парадку, вызначаемым з'ездам.

31. Цэнтральны Камітэт мае не менш аднаго пленарнага пасяджэння ў чатыры месяцы. Кандыдаты ў члены ЦК прысутнічаюць на пасяджэннях пленумаў ЦК з правам дарадчага голасу.

32. Цэнтральны Камітэт арганізуе: для палітычнай работы—Палітычнае бюро, для агульнага кіраўніцтва арганізацыйнай работай — Арганізацыйнае бюро і для бягучай работы арганізацыйнага і выканаўчага характару — Сакратарыят.

33. Цэнтральны Камітэт у прамежках паміж з'ездамі кіруе ўсёй работай партыі, прадстаўляе партыю ў зносінах з іншымі партыямі, арганізацыямі і ўстановамі, арганізуе розныя ўстановы партыі і кіруе іх дзейнасцю, назначае рэдакцыі цэнтральных органаў, працуючых пад яго кантролем і зацвярджае рэдактароў партыйных органаў буйных мясцовых арганізацый, арганізуе і вядзе прадпрыемствы, маючыя грамадскае значэнне, размяркоўвае сілы і сродкі партыі і загадвае цэнтральнай касай.

Цэнтральны Камітэт накіроўвае работу цэнтральных совецкіх і грамадскіх арганізацый праз партыйныя групы ў іх.

34. У мэтах узмацнення большэвіцкага кіраўніцтва і палітычнай работы, Цэнтральны Камітэт мае права ствараць палітычныя аддзелы і выдзяляць партыйных арганізатараў ЦК на адстаючых участках сацыялістычнага будаўніцтва, набываючых асабліва важнае значэнне для народнай гаспадаркі і краіны ў цэлым, а таксама па меры выканання палітычных мі аддзеламі сваіх ударных задач, ператвараць іх у звычайныя партыйныя органы, пабудаваныя па вытворча-тэрытарыяльнаму прынцыпу.

Палітаддзелы працуюць на правах адпаведных вытворчых партыйных камітэтаў і кіруюцца непасрэдна ЦК ВКП(б) праз вытворча-галінныя аддзелы ЦК або праз спецыяльна арганізуемыя палітвідзелы і палітсектары.

35. Цэнтральны Камітэт рэгулярна інфармуе партыйныя арганізацыі аб сваёй рабоце.

36. Камісія Партыйнага Кантролю:

а) кантралёруе выкананне рашэнняў партыі і ЦК ВКП(б);

б) прыцягвае да адказнасці вінаватых у парушэнні партыйнай дысцыпліны;

в) прыцягвае да адказнасці вінаватых у парушэнні партыйнай этыкі.

37. Цэнтральная Рэвізійная Камісія рэвізуе: а) хуткасць і правільнасць праходжэння спраў у цэнтральных органах партыі і наладжанасць апарата Сакратарыята ЦК ВКП(б), б) касу і прадпрыемствы ЦК ВКП(б).

(ПРАЦЯГ НА 2 СТАР.).

СТАТУТ УСЕСАЮЗНАЙ КОМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ (большэвікоў)

СЕКЦЫЯ КОМУНІСТЫЧНАГА ІНТЭРНАЦЫЯНАЛА

(Прынят аднагалосна XVII з'ездам ВКП(б)

(КАНЕЦ. ПАЧАТАК ГЛЯДЗІ НА 1 СТАР.).

VI. АБ КРАЯВЫХ—АБЛАСНЫХ—РЭСПУБЛІКАНСКІХ АРГАНІЗАЦЫЯХ ПАРТЫІ

38. Вышэйшым органам абласной—краявой—рэспубліканскай партыйнай арганізацыі з'яўляецца абласная—краявая партыйная канферэнцыя, або з'езд нацкомпартыі, а ў прамежку паміж імі абласны—краявы камітэт, ЦК нацкомпартыі. У сваёй дзейнасці яны кіруюцца агульнымі пастановамі Усесаюзнай Комуністычнай партыі і яе кіруючых органаў.

39. Чарговая краявая—абласная канферэнцыя або з'езд нацыянальных комуністычных партый склікаецца краявым—абласным камітэтам—ЦК нацкомпартый адзін раз у паўтары гады, а надзвычайная—па рашэнню краявога—абласнога камітэта—ЦК нацкомпартый, або па патрабаванню ⅓ агульнага ліку членаў арганізацыі, якія ўваходзяць у край—вобласць — рэспубліку.

Нормы прадстаўніцтва на краявую—абласную канферэнцыю, з'езд нацкомпартый устанаўліваюцца краявым—абласным камітэтам — ЦК нацкомпартый.

Краявая — абласная канферэнцыя, з'езд нацкомпартый заслухоўвае і зацвярджае справаздачныя даклады краявога—абласнога камітэта—ЦК нацкомпартый, рэвізійнай камісіі і іншых краявых—абласных устаноў, абмяркоўвае пытанні партыйнай, совецкай, гаспадарчай і прафесіянальнай работы ў краі—вобласці, або рэспубліцы і выбірае краявы—абласны камітэт (у рэспубліках ЦК нацкомпартый), рэвізійную камісію і дэлегатаў на ўсесаюзны з'езд партыі.

40. Краявы—абласны камітэт, а ў рэспубліках ЦК нацкомпартый выдзяляюць для бягучай работы аднаведныя выканаўчыя органы, у складзе не больш 11 чалавек, зацвярджаемыя ЦК ВКП(б), і двух сакратароў — першага і другога. Для сакратароў абавязковы партыйны стаж не менш 12 год.

41. Краявы—абласны камітэт ЦК нацкомпартый арганізуе розныя ўстановы партыі ў межах края—вобласці—рэспублікі, кіруе іх дзейнасцю, назначае рэдактара краявога—абласнога партыйнага органа, працуючага пад яго кантролем, кіруе партыйнымі групамі ў па-запартыйных арганізацыях, арганізуе і вядзе свае прадпрыемствы, маючыя агульнае значэнне для вобласці—края—рэспублікі, размяркоўвае ў межах сваёй арганізацыі сілы і сродкі партыі і загадвае краявой—абласной—рэспубліканскай партыйнай касай.

42. Пленум краявога—абласнога камітэта—ЦК нацкомпартый склікаецца не радзей аднаго разу ў тры месяцы.

43. Партыйныя арганізацыі нацыянальных і другіх абласцей і аўтаномных рэспублік, уваходзячых у склад краёў і рэспублік, працуюць пад кіраўніцтвам краявых камітэтаў—ЦК нацкомпартый і ў сваім унутраным жыцці кіруюцца палажэннямі, паданымі ў раздзеле VI статута партыі аб краявых, абласных і рэспубліканскіх арганізацыях.

VII. АБ ГАРАДСКІХ І РАЁННЫХ (сельскіх і гарадскіх) АРГАНІЗАЦЫЯХ ПАРТЫІ

44. Гарадская—раённая партыйная канферэнцыя склікаецца гарадскім—раённым камітэтам не радзей аднаго разу ў год, надзвычайная—па пастанове гарадскога—раённага камітэта або па патрабаванню ⅓ агульнага ліку членаў арганізацыі, уваходзячых у гарадскую—раённую арганізацыю.

Гарадская раённая канферэнцыя заслухоўвае і зацвярджае справаздачы гарадскога—раённага камітэта, рэвізійнай камісіі і іншых гарадскіх—раённых устаноў, выбірае гарадскі—раённы камітэт, рэвізійную камісію і дэлегатаў на краявую—абласную канферэнцыю або з'езд нацкомпартый.

45. Для сакратара гарадскога камітэта абавязковы 10-гадовы партыйны стаж, а для сакратара раённага камітэта — 7-гадовы. Сакратары гарадскога і раённага камітэтаў зацвярджаюцца абкомам, крайкомам або ЦК нацкомпартыі.

46. Гарадскі—раённы камітэт выбірае бюро ў складзе 5-7 чалавек, арганізуе і зацвярджае пярвічныя партыйныя арганізацыі на прадпрыемствах, у совгасах, МТС, калгасах і ўстановах, вядзе рэгістрацыю ўсіх комуністаў, арганізуе розныя ўстановы партыі ў межах горада, раёна, кіруе іх дзейнасцю, назначае рэдактара гарадскога — раённага партыйнага органа, працуючага пад яго кіраўніцтвам і кантролем, кіруе партыйнымі групамі па-запартыйных арганізацыях, арганізуе свае прадпрыемствы, маючыя агульна-гарадское, раённае значэнне, размяркоўвае ў межах горада і раёна сілы і сродкі партыі і загадвае гарадской—раённай касай. Гарадскі—раённы камітэт прадстаўляе краявому—абласному камітэту — ЦК нацкомпартыі справаздачу аб сваёй дзейнасці ў тэрміны і па форме, устаноўленым ЦК ВКП(б).

47. У буйных гарадах з дазволу ЦК ВКП(б) ствараюцца раённыя арганізацыі, падпарадкаваныя гарадскому камітэту.

VIII. АБ ПЯРВІЧНЫХ АРГАНІЗАЦЫЯХ ПАРТЫІ

48. Асновай партыі з'яўляюцца пярвічныя партыйныя арганізацыі. Пярвічныя партыйныя арганізацыі ствараюцца на фабрыках, заводах, совгасах і другіх гаспадарчых прадпрыемствах, у калгасах, МТС, чырвонаармейскіх частках, у сёлах, на ўстановах і т. п. пры наяўнасці не менш трох членаў партыі. На прадпрыемствах, у калгасах, установах і т. п., дзе ёсць менш трох членаў партыі, ствараюцца кандыдацкія або партыйна-комсамольскія групы на чале з парторгам, вылучаемым райкомамі, гаркомамі або палітаддзелам. Пярвічныя партыйныя арганізацыі зацвярджаюцца раённымі ці гарадскімі камітэтамі або аднаведнымі палітаддзелам.

49. У буйных прадпрыемствах, установах, калгасах і т. п. з вялікай колькасцю комуністаў (ад 10 членаў да 3000 і вышэй) унутры агульнай пярвічнай партыйнай арганізацыі, ахапляючай усё прадпрыемства, установу і т. п., могуць быць арганізаваны ў кожным асобным выпадку з зацвярджэння райкома—гаркома або аднаведнага палітаддзела партыйныя арганізацыі па цэхах, участках, аддзелах і т. п. У сваю чаргу ўнутры цэхавых, участковых і т. п. арганізацый могуць стварацца партыйныя групы па брыгадах, агрэгатах, прадпрыемствах і т. п.

50. Пярвічная партыйная арганізацыя звязвае работнікаў і сялянскія масы з кіруючымі органамі партыі. Яе задачай з'яўляюцца:

1) агітацыйная і арганізацыйная работа ў масах за партыйныя лозунгі і рашэнні;

2) прыцягненне спачуваючых і новых членаў і іх палітычнае выхаванне;

3) садзейнасць райкому—гаркому або палітаддзелу ў яго штодзённай арганізацыйнай і агітацыйнай рабоце;

4) мабілізацыя мас на прадпрыемствах, у совгасах, калгасах і інш. на выкананне вытворчага плана, умацаванне працоўнай дысцыпліны і разбіццё ўдарніцтва;

5) барацьба з расхлабанасцю і бесгаспадарчым вядзеннем справы на прадпрыемствах, у совгасах, калгасах і штодзённыя клопаты аб паляпшэнні бытавых умоў рабочых і калгаснікаў;

6) актыўны ўдзел як партыйнага органа ў эканамічным і палітычным жыцці краіны.

51. Для вядзення бягучай работы пярвічная партыйная арганізацыя выбірае партыйны камітэт (фабпартком, завпартком і т. п.) у складзе не больш 11 чалавек на 1 год, а цэхавая арганізацыя — партыйнага арганізатара, зацвярджаемага пярвічным партыйным камітэтам.

У партыйных арганізацыях, налічваючых менш 15 членаў і кандыдатаў партыі, партыйныя камітэты не ствараюцца, а выбіраюцца партыйныя арганізатары.

У пярвічных партыйных камітэтах, аб'ядноўваючых не больш 100 членаў партыі, партыйная работа вядзецца, як правіла, нявызваленымі ад работы на вытворчасці работнікамі. У парткомах з колькасцю членаў партыі да 1000 чалавек паніны працаваць 2-3 платныя работнікі, вызваленыя ад работы на вытворчасці. У парткомах з колькасцю членаў да 3000 і вышэй могуць працаваць 4-5 вызваленых ад вытворчасці таварышы.

Для сакратароў пярвічных партыйных камітэтаў абавязковы не менш, чым трохгадовы партыйны стаж, а для парторгаў—двухгадовы партыйны стаж.

IX. АБ ПАРТАРГАНІЗАЦЫЯХ У ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

52. Агульнае кіраўніцтва партыйнай работай у Чырвонай арміі, у Чырвоным флоце і авіяцыі ажыццяўляецца палітычным кіраўніцтвам РСЧА, якое працуе на правах ваеннага аддзела ЦК ВКП(б). Сваё кіраўніцтва ПУР праводзіць праз назначаемых ім палітаддзелы, ваенкомаў і партыйныя камісіі, выбіраемыя на аднаведных армейскіх канферэнцыях.

Партарганізацыі ў Чырвонай арміі, флоце і авіяцыі працуюць на аснове спецыяльнай інструкцыі, зацверджанай ЦК ВКП(б).

53. Для начальнікаў палітаддзелаў акруг, флотаў і арміі абавязковы 10-гадовы партыйны стаж, для начальнікаў палітаддзелаў дывізій і брыгад—6-гадовы партыйны стаж.

54. Паліторгаиы абавязаны падтрымліваць цесную сувязь з мясцовымі партыйнымі камітэтамі, шляхам пастаяннага ўдзелу ў мясцовых партыйных камітэтах кіраўнікоў паліторганаў і ваенкомаў (па мочнікаў па палітчастцы), а такса ма сістэматычнага заслухоўвання на парткамітэтах дакладаў начальнікаў паліторганаў і ваенкомаў (па мочнікаў па палітчастцы) аб палітрабоце ў вайсковых частях.

X. АБ ПАРТЫЙНЫХ ГРУПАХ У ПАЗАПАРТЫЙНЫХ АРГАНІЗАЦЫЯХ

55. На ўсіх з'ездах, нарадах і ў выбарных органах, па-запартыйных, совецкіх, прафесіянальных, кааператыўных і т. п. масавых арганізацый, дзе ёсць не менш 3 членаў партыі, арганізуюцца партыйныя групы, задачай якіх з'яўляецца ўсебаковае ўзмацненне ўплыву партыі і правядзенне яе палітыкі ў па-запартыйным асяродзішчы, умацаванне жалезнай партыйнай і совецкай дысцыпліны, барацьба з бюракратызмам, праверка выканання партыйных і совецкіх дырэктыў.

Для бягучай работы група выбірае сакратара.

56. Групы, незалежна ад іх значэння, цалкам падпарадкаваны аднаведным партарганізацыям (ЦК ВКП(б), крайком, абком, ЦК нацкомпартыі, гарком, райком). Па ўсіх пытаннях групы абавязаны строга і няўхільна трымацца рашэнняў кіруючых партыйных арганізацый.

XI. АБ УНУТРЫПАРТЫЙНАЙ ДЭМАКРАТЫІ І ПАРТЫЙНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

57. Свабоднае і дзелавое абмеркаванне пытанняў партыйнай палітыкі ў асобных арганізацыях або ў партыі ў цэлым з'яўляецца неадлучным правам кожнага члена партыі, выцякаючым з унутрыпартыйнай дэмакратыі. Толькі на аснове ўнутрыпартыйнай дэмакратыі можа быць разгорнута большэвіцкая самакрытыка і ўмацавана партыйная дысцыпліна, якая павінна быць свядомай, а не механічнай. Але шырокая дыскусія, асабліва дыскусія ўсесаюзнага маштаба па пытаннях партыйнай палітыкі, павінна быць арганізавана так, каб яна не магла прывесці да спроб незначнай меншасці навязаць сваю волю агрэгацыі большасці партыі, або да спроб стварэння фракцыйных групіровак, ламаючых адзінства партыі, да спроб расколу, якія могуць пахіснуць сілу і стойкасць дыктатуры пролетарыята на радасць ворагам рабочага класа. Таму шырокая дыскусія ўсесаюзнага маштаба можа быць цярпімана неабходнай толькі ў тым выпадку, калі: а) гэта неабходнасць прызнаецца па крайняй меры некалькімі мясцовымі арганізацыямі абласнога або рэспубліканскага маштаба; б) калі ўнутры ЦК няма ў наяўнасці дастаткова цвёрдай большасці ў важнейшых пытаннях партыйнай палітыкі; в) калі, не гледзячы на наяўнасць цвёрдай большасці ў ЦК, якая стаіць на поўным пункце погляду, ЦК усё-ж лічыць неабходным праверыць правільнасць сваёй палітыкі шляхам дыскусійнага абгаварэння ў партыі. Толькі пры выкананні гэтых умоў можна гарантаваць партыю ад злоўжыванняў унутры-партыйнай дэмакратыяй з боку антыпартыйных элементаў, толькі пры гэтых умовах можна разлічваць на тое, што ўнутрыпартыйная дэмакратыя пойдзе на карысць справе і не будзе выкарыстана ў шкоду партыі і рабочаму класу.

58. Захаванне адзінства партыі, бязлітасная барацьба з малейшымі спробамі фракцыйнай барацьбы і расколу, найстражэйшая партыйная і совецкая дысцыпліна з'яўляюцца першачарговым абавязкам усіх членаў партыі і ўсіх партыйных арганізацый. Каб ажыццявіць строгую дысцыпліну ўнутры партыі і ва ўсёй совецкай рабоце і дабіцца найбольшага адзінства пры знішчэнні ўсякай фракцыйнасці, ЦК ВКП(б) мае права прымяняць у выпадках парушэння дысцыпліны або адраджэння або дапушчэння фракцыйнасці ўсе меры партыйных спагнанняў аж да выключэння з партыі, а ў адносінах да членаў ЦК—перавод у кандыдаты і як крайнюю меру, выключэнне з партыі.

Умовай прымянення да членаў ЦК, кандыдатаў у члены ЦК і членаў камісіі партыйнага кантроля такой крайняй меры павінна быць скліканне пленума ЦК з запрашэннем усіх кандыдатаў у члены ЦК і ўсіх членаў камісіі партыйнага кантроля. Калі такі агульны сход найбольш адказных кіраўнікоў партыі двума трэцямі галасоў прызнае неабходным перавод членаў ЦК або камісіі партыйнага кантроля ў кандыдаты або выключэнне з партыі, то такая мера павінна быць ажыццёўлена неадкладна.

59. Пастановы партыйных і совецкіх цэнтраў павінны выконвацца быстра і дакладна. Невыкананне пастаноў вышэйшых арганізацый і другія праступкі, прызнаваемыя злачынныміграмадскай думкай партыі, цягнуць за сабой: для арганізацыі—ганьбаванне і агульную перарэгістрацыю (роспуск арганізацыі), для паасобных членаў партыі—той ці іншы від ганьбавання (пастаноўка на від, вымова і т. п.), публічнае ганьбаванне, часовае зняцце з адказнай партыйнай і совецкай работы, выключэнне з партыі, выключэнне з партыі з паведамленнем аб праступку адміністрацыйным і судовым уладам.

60. Члены партыі, якія адмаўляюцца праўдзіва адказваць на пытанні камісіі партыйнага кантроля, падлягаюць неадкладнаму выключэнню з партыі.

XII. АБ ГРАШОВЫХ СРОДКАХ ПАРТЫІ

61. Грашовыя сродкі партыі і яе арганізацый складаюцца з членскіх узносаў, даходаў ад прадпрыемстваў партыі і іншых паступленняў.

62. Штомесячныя членскія ўзносы для членаў партыі і кандыдатаў устанаўліваюцца ў наступным размеры:

Атрымліваючыя зарплату	да 100 р. плацяць—	руб.	20 кап.
„ „	ад 100 р. да 150 р. плацяць—	р.	60 к.
„ „	ад 151 р. да 200 р.	„	1 р. —к.
„ „	ад 201 р. да 250 р.	„	1 р. 50 к.
„ „	ад 251 р. да 300 р.	„	2 р. —
„ „ звыш	300 р. да 500 р.	„	2% зараб.
„ „	500 р.	„	3% зараб.

63. Уступныя ўзносы бяруцца пры ўступленні ў кандыдаты ў разме ры 2 проц. з атрымліваемай заработнай платы.

ПАПРАЎКА.

У спісе членаў ЦК ВКП(б), выбраных XVII з'ездам, змешчаным ва ўчарашнім нумары «Звязды», па віне ТАТА прыведзена прозвішча РАМАЎ, трэба чытаць РАЗУМАЎ М. О.

У спісе кандыдатаў у члены ЦК ВКП(б) прыведзена прозвішча ДЭРЫБАО, трэба чытаць ДЗРЫВАС.

АБ СТВАРЭННІ КАМІСІІ СОВЕЦКАГА КАНТРОЛЮ ПРЫ СОВЕЦЕ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ СССР

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта і Совета Народных Камісараў Саюза ССР

У мэтах узмацнення кантролю над выкананнем рашэнняў урада і ўмацавання совецкай дысцыпліны Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Совет Народных Камісараў Саюза ССР пастанаўляюць:

1. Перафармаваць Камісію Выканання пры Совеце Народных Камісараў Саюза ССР у Камісію Совецкага Кантролю пры Совеце Народных Камісараў Саюза ССР, маючую свой апарат у цэнтры і пастаянных прадстаўнікоў у саюзных і аўтаномных рэспубліках, краях і абласцях, назначаемых і адкліканых Камісіяй Совецкага Кантролю.

2. Народны Камісарыят Рабоча-Сялянскай Інспекцыі Саюза ССР, народныя камісарыяты рабоча-сялянскай інспекцыі саюзных рэспублік і мясцовыя органы рабоча-сялянскай інспекцыі, як ужо адыгралі сваю станоўчую ролю, скасаваць.

Апарат рабоча-сялянскай інспекцыі перадаць Камісіі Совецкага Кантролю пры Совеце Народных Камісараў Саюза ССР.

3. Даручыць старшыні Камісіі Совецкага Кантролю пры Совеце Народных Камісараў Саюза ССР у дэкадны тэрмін распрацаваць і ўнесці на зацвярджэнне Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта і Совета Народных Камісараў Саюза ССР праект палажэння аб камісіі Совецкага Кантролю.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР
М. КАЛІНІН.

Старшыня Совета Народных Камісараў Саюза ССР
В. МОЛАТАЎ (СКРАБІН).

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР
А. ЕНУКІДЗЕ.

Масква, Крэмль.
11-га лютага 1934 года.

АБ ЗАЦВЯРДЖЭННІ СКЛАДУ БЮРО КАМІСІІ СОВЕЦКАГА КАНТРОЛЮ ПРЫ СНК СССР

Пастанова Совета Народных Камісараў Саюза ССР

Совет Народных Камісараў Саюза ССР пастанаўляе:

Зацвердзіць выбранае Камісіяй Совецкага Кантролю пры Совеце Народных Камісараў Саюза ССР бюро Камісіі ў наступным складзе:

1. Куйбышэў В. В. (старшыня).
2. Анціпаў Н. К. (нам. старшыні).
3. Ройзенман Б. А.
4. Ломаў Г. І.
5. Ціхан А. М.
6. Масквін І. М.
7. Ульянава М. І.
8. Беленькі З. М.
9. Землячка Р. С.
10. Дэйч М. А.
11. Гайстэр А. І.

Старшыня Совета Народных Камісараў Саюза ССР
В. МОЛАТАЎ (СКРАБІН).

Кіраўнік справаў Совета Народных Камісараў Саюза ССР
І. МІРОШНІКАЎ.

11-га лютага, 1934 г.
Масква. Крэмль.

У Парыжы пачалася усеагульная палітычная забастоўка

Не гледзячы на сабатаж рэфармісцкіх лідэраў ствараецца магутны адзіны пролетарскі фронт.—Усеагульная забастоўка праходзіць пад лозунгам барацьбы супроць фашысцкай рэакцыі і наступлення капітала.

ЛОНДАН, 11 лютага. (БЕЛТА). Мяркуючы па першых вестках, УСЕАГУЛЬНАЯ ЗАБАСТОЎКА ў ПАРЫЖЫ ПАЧАЛАСЯ. Войскі ахоўваюць галоўны паштамт, электрычную станцыю, тэлефон, чыгуначныя станцыі і пажарныя станцыі. На тэлефонныя станцыі ўведзены інжынерныя войскі, каб падтрымліваць самую неабходную сувязь. На паштамце разберкай пісем заняты салдаты. У ТРЫ ГАДЗІНЫ РАНІЦЫ СЛУЖАЧЫЯ ЦЭНТРАЛЬНАГА ТЭЛЕГРАФА КІНУЛІ РАБОТУ. Спыніла работу таксама радыёстанцыя. Сувязь паміж Парыжам і Лонданам перарвана. Сувязь паміж Парыжам і Лонданам падтрымліваецца толькі па адзінаму проваду, які абслугоўваецца войскамі. Цэнтральны стачком у Парыжы зносіцца з раённымі стачачнымі камітэтамі з дапамогаю спецыяльна вылучаных шофераў таксі, якія маюць спецыяльны стачачны флажок.

Наперакор рэфармісцкіх лідэраў не ўцягнуць у забастовачны рух рабочых з прадпрыемстваў грамадскага карыстання, як, напрыклад, электрычная станцыя, газ, водаправод і чыгунка, СЯРОД ЧЫГУНАЧНІКАЎ ЁСЦЬ МОЦНЫ РУХ ЗА ДАЛУЧЭННЕ ДА ЗАБАСТОЎКІ НА ЎСЕ 24 ГАДЗІНЫ. За выключэннем чыгуначнага транспарта ЎСЕ СПЫНІЛАСЯ. Не выходзяць ніякія газеты, апрача манархісцкай «Аксіон франсез» і стачачнага бюлетэня. Усе школы закрыты. Усе магазіны, за выключэннем дробных крам, закрыты.

У ДНІ ПАДРЫХТОЎКІ ДА СТАЧКІ

ПАРЫЖ, 11 лютага. (БЕЛТА).

Падрыхтоўка да ўсеагульнай палітычнай забастоўкі, якая павінна пачацца ў ноч на 12-га лютага, ідзе ў ніяла вялікарны размах. Не гледзячы на тое, што рэфармісцкія лідэры сабатуюць адзіны пролетарскі фронт, прабуюць абмежаваць рамкі руху і пераўтварыць палітычную забастоўку ў «сімвалічны рух», па выражэнню лідэра соцыял-рэфармісцкіх саюзаў Жуо, — пад націскам рабочых мас, абураных абнаглеўшай рэакцыяй, ствараецца магутны адзіны фронт рабочых усіх палітычных напрамкаў — членаў унітарных (рэволюцыйных), рэфармісцкіх і аўтаномных профсаюзаў.

ЗЛІВАЕЦЦА АДЗІНЫ ПРОЛЕТАРСКІ ФРОНТ

Апублікаваны ўчора ў «Юманітэ» зварот пяці буйных парыжскіх унітарных профсаюзаў з заклікам стварыць адзіны фронт і правесці сумесна забастоўку 12-га лютага пад лозунгам барацьбы супроць фашысцкай рэакцыі і супроць наступлення капітала — знайшоў гарачы водгук сярод парыжскіх рабочых.

Пад напорам рабочай масы рад рэфармісцкіх профсаюзаў адказаў згодай па прапанове ўнітарных профсаюзаў. Учора унітарны, рэфармісцкі і аўтаномны профсаюзы работнікаў метро выпусцілі сумесную адозву да сваіх членаў з заклікам спыніць поўнасцю работу 12-га лютага.

ПАДРЫХТОЎКА НА ПРАДПРЫЕМСТВАХ

Профсаюзы газавых заводаў, работнікаў палітоных прадпрыемстваў, тэлефонных станцый і тэлеграфаў таксама далучыліся да прапановы унітарных профсаюзаў і выпусцілі сумесную адозву аб правядзенні ўсеагульнай забастоўкі.

На аб'яднаным сходзе рабочых манетнага двара — членаў усіх профсаюзаў — таксама адзадушна пастановлена далучыцца да ўсеагульнай забастоўкі. Унітарныя профсаюзы работнікаў булачных, дрэваапрацоўчых прадпрыемстваў, друкарняў, электрастанцый, тэкстыльных прадпрыемстваў, камерцыйных прадпрыемстваў, папяровых фабрык, будаўнікоў звярнуліся да рэфармісцкіх і аўтаномных профсаюзаў з прапановай стварыць адзіны фронт для правядзення і арганізацыі забастоўкі. Унітарныя і рэфармісцкія профсаюзы настаўнікаў дэпартамента Сены пастанавілі ў поўным складзе прыняць удзел у забастоўках. У сувязі з гэтым 12-га лютага ніякіх запяткаў у школах не будзе.

РАБОЧЫЯ ПРАВІНЦЫЙ ДАЛУЧАЮЦА ДА ПАРЫЖСКАГА ПРОЛЕТАРЫЯТА

У правінцыі ідзе таксама энергічная падрыхтоўка да забастоўкі. Кіраўніцтва профсаюза дзяржаўных служачых атрымала паведамленні з 147 пунктаў аб падрыхтоўцы мясцовых аддзяленняў профсаюзаў да забастоўкі. Згодна паведамлення «Пенль», рэфармісцкія профсаюзы гарнякоў дэпартаментаў Па-дэ-Кале і Нор, профсаюзы работнікаў электрастанцый, друкарняў, будаўнікоў таксама парашылі прыняць удзел у забастоўцы.

АДПОР РЭФАРМІСЦКАМУ САБАТАЖУ

Паміма таго, усеагульная забастоўка 25 тыс шофераў таксі таксама будзе прадаўжацца. Ні адна газета не выйдзе ў гэты дзень. Усе школы будуць закрыты. Лідэры рэфармісцкага профсаюза чыгуначнікаў прабуюць сабатаваць забастоўку, заклікаючы сваіх членаў абмежавацца 15-мінутнай забастоўкай, але унітарны (рэволюцыйны) профсаюз чыгуначнікаў выпусціў адозву, у якой заклікае чыгуначнікаў прыняць удзел разам з усім пролетарыятам у 24-гадзінным усеагульнай забастоўцы.

Усеагульная унітарная канфедэрацыя працы выкрывае таксама двудушнасць рэфармісцкіх лідэраў, аб'явіўшых усеагульную забастоўку і разам з тым заклікаючых рабочых да захавання спакою і сабатуючых фактычна ўжо зараз забастоўку на чыгунках і на прадпрыемствах грамадскага карыстання.

Усеагульная унітарная канфедэрацыя працы заклікае ўвесь французкі пролетарыят прыняць удзел ва ўсеагульнай палітычнай забастоўцы, выйсці на вуліцу, праводзіць дэманстрацыі, ствараць на прадпрыемствах камітэты дзейнасці, выстаўляць каля варот заводаў пікеты. Разам з тым канфедэрацыя заклікае парыжскіх рабочых прысці пасля абеда ў Венсенскі лес, дзе павінен адбыцца грандыёзны мітынг адзінага фронта.

НАРАДА УСІХ ПРЭФЕКТАЎ ПАЛІЦЫІ

Упады таксама ўзмоцнена рыхтуюцца да дня 12-га лютага. Сёння пасля пасяджэння кабінета міністраў міністр унутраных спраў Саро склікаў усіх прэфектаў паліцыі дэпартамента Сены і прадстаўнікоў ваенных улад у Парыжы. На нарадзе пастаноўлена было прыняць рад спецыяльных мер у сувязі з чакаемымі падзеямі 12-га лютага.

КЛАСАВЫЯ БАІ Ў АЎСТРЫІ

Аб'яўлена ўсеагульная забастоўка

БЕРЛІН, 12 лютага. (БЕЛТА). Германскае інфармацыйнае бюро паведамляе, што ў **Вене** роўна з 12-гадзінае дня **электрастанцыі спрыпынілі падачу тока.** Увесь горад без электрычнасці. Мяркуюць, што **ўсеагульная забастоўка з'яўляецца адказам на падзеі ў Лінцы.** Тэлефонная сувязь парушана ў сувязі з тым, што адсутнічае электрычны ток. Пакуль, паведамляе бюро, яшчэ не вядома, на які тэрмін аб'яўлена гэта забастоўка.

Сутычкі рабочых з паліцыяй і войскамі

БЕРЛІН, 12 лютага. (БЕЛТА). Германскае інфармацыйнае бюро паведамляе аб цяжкіх баях паміж соцыял-дэмакратычнымі рабочымі, з аднаго боку і войскамі і паліцыяй з другога боку, якія адбываюцца ў **Лінцы** (Аўстрыя). У вакольцах Лінца таксама адбываюцца зіткненні соцыял-дэмакратычных дэманстрацый. Паліцыя патрабавала прысылкі ваенных падмацаванняў.

ПРАЕЗД МІНІСТРА ЗАМЕЖНЫХ СПРАЎ ПОЛЬШЧЫ п. БЕКА

НЕГАРЭЛАЕ. (Ад нашых спецыяльных карэспандэнтаў).

Учора ў 6 гадзін вечара праз Негарэлае праехаў накіроўваючыся ў Маскву міністр замежных спраў Польшчы п. Бек з жонкай.

Разам з п. Бекам прыехаў паўнамочны прадстаўнік СССР у Варшаве тав. Антонаў-Аўсеенка.

На станцыі Негарэлае міністра сустракалі генеральны сакратар НКЗС СССР тав. Дзвінькоўскі, упаўнаважаны НКЗС пры ўрадзе БССР тав. Ільінскі, прадстаўнікі ТАСС і рэдакцыі «Звязды».

Тав. Дзвінькоўскі вітаў міністра ад імя НКЗС, а тав. Ільінскі ад імя Урада БССР.

Міністра суправаджаюць шэф кабінета міністэрства п. Дэмбіцкі і асабовы сакратар п. Балінскі, а таксама прадстаўнікі польскага тэлеграфнага агенцтва («Пат»), агенцтва «Іскра» і рэдакцыі газеты «Курэр поранны».

Акрамя таго, міністра ад Стабліцоў суправаджаюць выехаўшыя яму насустрач совецкіх міністраў у Маскве п. Сакальніцкі і польскі генеральны консул у Менску п. Ляфецкі.

Па прыбыцці курэрскага поезда у Менск міністра сустракалі на вакзале старшыня СНК БССР тав. Гападзеў, намеснік старшыні СНК тав. Балцін і народны камісар асветы тав. Чарнушэвіч.

Тав. Гападзеў вітаў п. Бека на тэрыторыі БССР, выказаўшы ўпэўненасць, што яго паездка ў Маскву паспрыяе ўзмацненню міру і далейшага зблізкання паміж СССР і Польшчай.

АРГАНІЗАЦЫЙНЫЯ ПЫТАННІ
(ПАРТЫЙНАЕ І СОВЕЦКАЕ БУДАЎНІЦТВА)

Даклад тав. Л. М. КАГАНОВІЧА на XVII з'ездзе ВКП(б)

6 ЛЮТАГА 1934 ГОДА

Таварышы! Арганізацыйныя пытанні абгаворваюцца нашым з'ездам апошнім пытаннем парадку дня. Заканамернасць гэтага зусім відавочна, бо распрацоўка арганізацыйных пытанняў ёсць адточванне інструмента для паспяховага ажыццяўлення палітычных і эканамічных задач, пастаўленых партыяй на XVII з'ездзе. Зразумець да канца сутнасць арганізацыйных задач можна толькі зразумеўшы і ацэніўшы ўсю веліч і сэнс пройдзенага намі шляху, шляху сацыялістычных перамог, усю веліч пастаўленых перад намі задач, так ярка асветленых магутным пражэктарам справаздачнага даклада т. **СТАЛІНА (доўгія апладысменты).**

Кожны з'езд нашай партыі, вядучай партыі суседзкага пролетарыята, ёсць буйная гістарычная веха ў развіцці не толькі пролетарскай рэволюцыі ў нашай краіне, але і міжнароднага рабочага руху.

Наш XVII з'езд, вялікі с'езд вялікай ленінскай партыі, адлюстроўвае цэлую гістарычную эпоху, кароткую па тэрміне, але як бачана багатую па зместу, эпоху, ператварыўшую Совецкі Саюз у магутную дзяржаву, заняўшую не раўнай вагі ў палітычных, тэхніка-эканамічных, ваенных і культурных адносінах.

Сусветнагістарычнае значэнне даклада т. Сталіна на XVII з'ездзе заключаецца ў тым, што гэта была справаздача аб кіраўніцтве найвялікшым пераваротам які толькі ведала гісторыя чалавецтва, пераваротам, зламаўшым стары эканамічны уклад і стварыўшым новы калгасны лад на базе сацыялістычнай індустрыялізацыі нашай краіны.

Гэта была справаздача аб кіраўніцтве рухам мільёнаў лепшых перадавых пралетарыяў чалавецтва ў іх барацьбе за поўнае і канчатковае вызваленне ад старога свету і за перамогу новага, сацыялістычнага грамадства.

Ісціна таму нашы грандыёзныя поспехі кажуцца ўяўляюць і ацэньваюць не толькі мільёны масы Совецкага Саюза, але і пролетарыі і прыгнечаныя ўсяго свету.

У небывала кароткія тэрміны на базе сацыялістычнай індустрыялізацыі краіны, тэхнічнага пераўзбраення сельскай гаспадаркі, разгрому кулацтва і агентуры клясавага ворага ў нашай партыі — трацкізма, правых, «левых» і ўсіх і ўсялякіх апартуністаў — мы выканалі найтруднейшую задачу пролетарскай рэволюцыі.

Тав. Сталін у сваім дакладзе па казаў, як мы ператварым краіну распыленай, дробнай і драбнотнай сялянскай гаспадаркі ў краіну, дзе калгасны лад — лад буйнейшага сацыялістычнага земляробства — канчаткова перамог, дзе сацыялістычная форма гаспадарання з'яўляецца асноўным укладам нашага жыцця.

Сапраўды, чым мы былі і чым сталі за некалькі год, якія адзяляюць нас ад XVI з'езда?

Мы былі адной з самых адсталых у прамысловых адносінах краін, адной з самых аграрных краін у Еўропе. Мы сталі адной з самых індустрыяльных краін у свеце.

Мы былі краінай дробнага, распыленага і адсталага земляробства. Мы сталі краінай арганізаванага, самага буйнога ў свеце, механізаванага земляробства.

Мы былі краінай сахі. Мы сталі краінай трактара і камбайна.

Мы былі краінай патрыярхальшчыны, сярэдневякоўя і непісьменнасці.

Мы сталі, вярней становімся адной з самых перадавых краін у адносінах пісьменнасці, культурнасці.

Мы на многа адставалі ад перадавых капіталістычных краін ў ваенных адносінах і заўсёды знаходзіліся пад пагрозай ушчамлення нашых інтарэсаў нават невялікімі краінамі. Цяпер мы сталі, як гэта было асабліва наглядна выяўлена на з'ездзе, **першакласнай, магутнай, узброенай сілай і адным з рашаючых фактараў у барацьбе за мір ва ўсім свеце** (апладысменты).

Мы дасягнулі ўсяго гэтага, таварышы, у жорсткай барацьбе з шматлікімі класавымі ворагамі, у барацьбе з апошнім сур'ёзным капіталістычным клясам — кулацтвам. Яго падтрымліваў сусветны капіталізм шляхам арганізацыі шкодніцтва і контрэволюцыйных груп; яго падтрымлівалі разбітыя намі правыя, трацкісты і «левыя» апартуністы ў нашых уласных радах. Мы разграмілі кулацтва, разграмілі шкодніцкія, контрэволюцыйныя групы і апартуністаў.

Кулак меў буйнейшыя карэнні ў эканоміцы. Гэтыя карэнні наша партыя вырвала з боем. Гэта быў адзін з самых сур'ёзных, калі не самы сур'ёзны бой з капіталізмам. Сур'ёзнасць і труднасць гэтага бою геніяльна прадбачыў Ленін. Па XI з'ездзе нашай партыі ён гаварыў:

«Многа ў нас было ўсякіх ходаў і выхадаў з нашых палітычных і эканамічных труднасцей. Мы можам з гонарам пахвастацца, што мы па гэтага часу ўмелі скарыстаць усе гэтыя ходы і выхады ў розных спалучэннях, прыстасоўна да розных абставін, але цяпер у нас больш ніякіх выхадаў няма. Дазвольце гэта вам сказаць без усякага перавялічэння, так што ў гэтым сэнсе сапраўды

«апошні і рашучы бой» не з міжнародным капіталізмам, — там яшчэ шмат будзе «апошніх і рашучых баёў»,—не, а вось з рускім капіталізмам, з тым, які расце з дробнай сялянскай гаспадаркі, з тым, які ім падтрымліваецца. Вось тут прадстаіць у бліжэйшым будучым бой, тэрмін якога нельга дакладна вызначыць. Тут прадстаіць «апошні і рашучы бой», тут больш ніякіх ні палітычных, ні ўсякіх другіх абходаў быць не можа»...

(Т. XXVII, стар. 235).

Гэты апошні і рашучы бой з рускім капіталізмам ёсць галоўнае і асноўнае звяно пройдзенага намі вялікага шляху. У гэтыя гады мы правялі апошні і рашучы бой з рускім капіталізмам, бой, які прадракаў Ленін. **І гэты бой геніяльна і праможна праведзен вялікай арміяй комунізма — нашай партыяй пад кіраўніцтвам свайго правадыра тав. Сталіна (бурныя апладысменты).**

Вынік гэтага бою — моцны фундамент сацыялістычнай эканомікі ў нашай краіне, умацаванне пазіцый міжнароднай пролетарскай рэволюцыі.

На ўсіх этапах гэтага бою, пры ўсіх труднасцях, якія сталі ў нас на шляху, ці ідзе гутарка аб барацьбе за ленінскае вучэнне аб пабудове сацыялістычнага грамадства ў асобна ўзятай краіне, ці ідзе гутарка аб канкрэтных палітычных лозунгах, ці ідзе гутарка аб пабудове і асваенні такіх гігантаў металургіі, як Магнітагорскі і Кузнецкі, аб арганізацыі соўгасаў, МТС, калгасаў, ОРС'аў, сталовых грамадскага харчавання і т. д., наш Ленінскі ЦК і перш за ўсё тав. Сталін узбройваў і арганізоўваў масы для пабеданосных баёў.

У гэтай барацьбе і рабоце Цэнтральны Камітэт увесь час падкрэсліваў рашаючае значэнне суб'ектыўнага фактара, рашаючае значэнне арганізаванасці, мабілізаванасці і падрыхтаванасці жывых людзей, якія творацъ справу сацыялізма.

Наша партыя, яе Цэнтральны Камітэт і тав. Сталін — гэта адзіная, неразрыўная сіла партыйнага кіраўніцтва, здолелі падняць барацьбу за сацыялізм да ўзроўню сапраўды грандыёзных маштабаў.

Гэта іменна і паказаў тав. Сталін, прадставіўшы з'езду справаздачу, якая ярка асвятляе шлях і ўмовы перамогі сацыялізма, даўшы аналіз пройдзенага і адначасова намеціўшы баявую, канкрэтную праграму дзеянняў для ідучай наперад арміі сацыялізма.

Даклад тав. Сталіна геніяльна спалучае пытанні найглыбейшай тэорыі палітыкі і арганізацыйнай практыкі. Гэта адзінства волі і дзеянняў, адзінства палітыкі і практыкі, якое характарызуе дзейнасць нашага Ленінскага ЦК, лежыць у аснове ўсёй палітычнай і арганізацыйнай работы, якую партыя правяла, праводзіць і намячае правесці пад кіраўніцтвам тав. Сталіна **(бурныя апладысменты).**

I. Размах арганізацыйнай работы партыі ў гады першай пяцігодкі

Пераходзячы да арганізацыйных пытанняў, трэба сказаць, што ў аснове прапануемых з'езду тэзісаў ляжаць тыя задачы, якія былі пастаўлены тав. Сталіным яшчэ ў 1929 г. на красавіцкім пленуме ЦК ВКП(б), калі ён, выкрываючы правы ўхіл, гаварыў аб сутнасці большэвіцкага наступлення і перабудове вагароў пролетарскай дыктатуры. Тав. Сталін гаварыў аб гэтым і ў справаздачы на XVI з'ездзе нашай партыі, а таксама ў прамове на нарадзе гаспадарнікаў у 1931 годзе, вядомай, як шэсць гістарычных умоў нашай перамогі.

Калі выкананне плана першай пяцігодкі падрыхтавала ўсе матэрыяльныя прадпасылкі для паспяховага ажыццяўлення плана другой пяцігодкі, аб якой тут дакладвалі тт. **Молатаў і Куйбышэў,** то арганізацыйная работа, праведзеная ў першай пяцігодцы, дазваляе нам цяпер прадоўжыць, прыстасоўна к задачам другой пяцігодкі, халейшую перабудову і паляпшэнне ўсіх вагароў пролетарскай дыктатуры.

Уся аграмадная арганізацыйная работа, уся паглыбленая перабудова, якую партыя правяла за гэтыя гады, была цалкам падпарадкавана вырашэнню вузлавых задач сацыялістычнага наступлення па ўсяму фронту.

Наш Цэнтральны Камітэт у сваім кіраўніцтве ніколі не абмяжоўваўся толькі лозунгамі або агульнапалітычнымі дырэктывамі. Тав. Сталін, высоўваючы чарговыя лозунгі нашай генеральнай лініі, заўсёды тут-жа забяспечваў выкананне гэтых лозунгаў практычным планам арганізацыйных дзеянняў, канкрэтнымі ўказаннямі аб шляхах і спосабах выканання тых або іншых задач.

Тав. Сталін у сваім дакладзе па XVII з'ездзе падкрэсліў, што «перамога ніколі не прыходзіць сама, —не звычайна прыцягваюць». Гаворачы аб арганізацыйнай рабоце партыі, ён у 14 сціслых пунктах даў, па сутнасці справы, вычарпальную справаздачу аб арганізацыйнай рабоце партыі, аб шляхах, якія арганізуюць і забяспечваюць перамогу.

Арганізацыйная работа партыі прыняла за гэтыя гады сапраўды небывалы размах. **Тысячы нова-пабудаваных прадпрыемстваў, МТС, калгасаў і соўгасаў з'яўляюцца матэрыяльным выражэннем палітычнай лініі і арганізацыйнага кіраўніцтва партыі.**

Лозунг большэвіцкіх тэмпаў індустрыялізацыі краіны, лозунг сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі, лозунг аўладання тэхнікай партыя ажыццяўляла перш за ўсё шляхам мабілізацыі мас, перабудовы ўсіх прыводных пасаў, у першую чаргу профсаюзаў, разграміўшы апартуністычныя, трэд'юніяністскія элементы профсаюзаў, павярнуўшы профсаюзы тварам да ўдарніцтва і спаборніцтва, ад новых сацыялістычных метадаў працы.

Партыя перабудавала свае ўласныя рады на вытворчасці і ў калгасах, упарта дабіваючыся авангардная, арганізатарскай ролі кожнага комуніста ў цэху, у брыгадзе.

Задача сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі была забяспечана мабілізацыяй мас па ліквідацыю кулацтва, на перамаганне супраціўлення яго астаткаў, падборам для вёскі многіх і многіх тысяч праверaных, загартаваных большэвікоў і паляпшэннем работы ўсіх нашых партыйных, совецкіх і гаспадарчых арганізацый.

Тав. Сталін гаварыў аб тысячах новых прадпрыемстваў, пабудаваных за гады пяцігодкі. Гэта азначае, таварышы, што **штодзенна** у сярэднім у нас заканчвалася і пускалася па некалькі прадпрыемстваў.

Для пабудовы ўсіх гэтых тысяч новых прадпрыемстваў мала было ўключыць іх у план, мала было адгусціць сродкі; неабходна было **арганізаваць** самую пабудову, г. зн. арганізаваць будаўнічы апарат, падабраць людзей, а пасля пабудовы прадпрыемстваў назначыць новых людзей, арганізаваць апарат кіраўніцтва, пусціць прадпрыемствы і асвоіць іх.

За 1929-1933 гг. арганізавана 191 тыс. калгасаў, каля 7 тыс. соўгасаў, лічачы і непраставаныя. Гэта азначае, што **штодзенна** ў сярэднім арганізоўвалася па 120 калгасаў, па 2 МТС, па 4 соўгасы. Гэта — у сярэднім, а вы ведаеце, што ў нас справа ішла нетоўнамерна: былі дні, калі арганізоўвалася не па 120, а па 500 і больш калгасаў. Сюды трэба яшчэ дадаць арганізацыю 150 тыс. з лішнім гандлёвых адзінак, зусім небывалы да пяцігодкі размах будаўніцтва гарадской гаспадаркі, гарадскіх сантэхнічных прадпрыемстваў у старых гарадах і стварэнне на голым месцы дзесяткаў новых гарадоў, тысяч пасёлкаў, школ соўгасаў, МТС і новых заводаў.

Адкрыта 35 тыс. пачатковых і сярэдніх школ, дзве тысячы школ фабрычна-заводскага навучэбніцтва, тысяча рабфакаў, 2½ тыс. тэхнікумаў, каля поўтысячы ВНУ, звыш 400 навукова-даследчых інстытутаў, 23 тыс. устаноў клубнага тыпу, амаль 20 тыс. новых кінаўстановак. Друк вырас з 1.189 газет у 1928 г. і 3.061 у 1930 г. да 10.535 друкаваных газет у 1933 г., не лічачы некалькіх сотень тысяч насценных газет.

Уся гэта будоўля вялася не на адным месцы, а па ўсіх бізмежных прасторах вялікага Совецкага Саюза. Многія гарады, прадпрыемствы і калгасы ствараліся не ў культурных рэгіёнах, дзе ёсць кадры, навыкі, пэўны вопыт работы, а ў зусім ненаселеных месцах, на голай зямлі, на пустырах. Калі ўспомніць, што ва ўсіх аддаленых кутках СССР — ад Хібін да Кара-Бума, ад Іграфі да Рыбна, ад Беламорска-Балтыйскага канала да Турксіба, Ад Дняпрадрэса да Амура, вялася напружаная будаўнічая работа, у рэзультаце якой за некалькі год літаральна загніўся твар нашай краіны; калі зразумець, што пабудова ўсяго гэтага патрабавала практычна арганізацыйна забяспечыць гігантскую работу людзямі, кіраўніцтвам, — тады будзе зусім ясным небывалы размах арганізацыйнай работы нашай партыі і яе Ленінскага ЦК. **(Бурныя апладысменты).**

Дазвольце мне не спыняцца падрабязна на ўсіх этапах арганізацыйнай работы за гэтыя гады. Гэта заняло-б занадта шмат часу, дый работа гэта ва ўсіх на віду. Кожная будоўля кожны новы завод, кожная МТС, кожны калгас гавораць сам за сябе. Дазвольце ў парадку справаздачным спыніцца на вузлавым пытанні арганізацыйнай работы — на праблеме кадраў, на выхаванні, падрыхтоўцы, падборы і размеркаванні людзей.

1. ПЯЦІГОДКА ПАДВОІЛА ЛІК СПЕЦЫЯЛІСТАЎ

Вы ведаеце, што пытанне аб кадрах аказалася адным з самых вострых пытанняў сацыялістычнага будаўніцтва. Значная частка старых кадраў спецыялістаў аказалася непрыстасавальнай нават пры ўсім сваім жаданні, к новым задачам, к новым тэмпам. Можна сабе ўявіць: калі ў радах большэвіцкай партыі, у радах большэвікоў, нават у радах Цэнтральнага Камітэта аказалася людзі, не вытрымаўшыя большэвіцкіх тэмпаў, людзі, якія адсталі, выпустылися, у якіх не аказалася пораху для новай вялікай справы, тое што было са многімі старымі беспартыйнымі спецыялістамі, вышэйшымі часта з чужога лагера? Партыя працавала над удасканаленнем лепшых з старых спецыялістаў у сацыялістычнае будаўніцтва, і ў адносінах лепшых гэта задача была выканана. Мы маем шмат герояў са старых спецыялістаў, але частка свядома шкодзіла, частка-ж аказалася непрыгодная для новых метадаў і быстрых тэмпаў работы.

Задача стварэння свайго, роднага пролетарыята, кампенсавання склаву сацыялістычнай вытворчасці была і астаецца буйнейшай гістарычнай задачай сацыялізма. Ва ўсёй сваёй вострасці гэта задача была пастаўлена тав. Сталіным яшчэ ў 1928 годзе, у сувязі з вядомым шахцінскім працэсам шкодніцкіх.

Шахцінскі працэс паказаў, што значная частка старых тэхнічных кадраў ненадзейная і ў трушную мінуту здраджвае пролетарыяту. З другога боку, шахцінскі працэс, як усе наступныя працэсы, адкрыў, што многія з нашых комуністаў — кіруючых работнікаў, не валодаючы тэхнікі і не працуючы ўлучаць ёю, слепа давяраліся гэтым спецыялістам, працавалі як «камісары» горшага тыпу, штампавалі паперы, не ўваходзілі ў сутнасць справы і тым самым аблягчалі работу шкоднікаў.

Многія ў 1928 годзе не зразумелі вялікага значэння праблемы кадраў. У спрачках, якія былі тут, у гэтым зале, на пленуме Цэнтральнага Камітэта па прыватнаму арганізацыйнаму пытанню — аб рэарганізацыі ВНУ і ВТНУ і перадачы іх вытворчым наркаматам, некаторыя выступалі агітуністычна. То яны або не разумелі, або не хацелі большэвіцкага размаху сацыялістычнага будаўніцтва, то яны супраціўляліся рашэнню праблемы падрыхтоўкі кадраў. Я гавару аб выступленнях за тым пленуме тав. Рыкава і інш. Але былі таны і такія таварышы, якія сталі за размах сацыялістычнага будаўніцтва, але не зразумелі таны, што ў гэтым арганізацыйным пытанні заключа ла вяскнейшая ўмова поспеху сацыялістычнага наступлення.

Усе вы памятаеце, якія рашэнні прыняў Цэнтральны Камітэт у лідзе 1928 года, якія рашэнні прынялі ЦК у лістападзе 1929 г. у парадку праверкі выканання пастаноў 1928 года.

Цэнтральны Камітэт на працягу ўсяго справаздачнага перыяда ўпарта і настойліва вяртаўся да пытання аб кадрах, удакладняючы, паляпшаючы работу па іх выхаванню і вырошчванню. Цэнтральны Камітэт займаўся гэтым пытанням не толькі з пункту гледжання агульных установак, але і з пункту гледжання паляпшэння якасці вучобы, вытворчай практыкі, будаўніцтва новых ВТНУ, тэхнікумаў, падбору студэнтаў, іх пасылкі на вытворчасць па скарачэнні вучобы і т. д.

Дазвольце, таварышы, прывесці таблічку, чаго жы пабіліся ў падрыхтоўцы нашай совецкай вытворча-тэхнічнай інтэлігенцыі.

ПА ВНУ і ВТНУ

	1928 г.	1933 г.
Колькасць ВНУ і ВТНУ у СССР па ўсіх галінах	120	600
Колькасць студэнтаў у іх (у тысячах)	160	491

Падвоіўся процант рабочых у складзе студэнтаў ВНУ і ВТНУ: 1928 г. — 25 проц., 1933 г. — 50 проц. Процант комуністаў у складзе студэнтаў ВНУ і ВТНУ падняўся з 15-ці ў 1928 г. да 22 проц. у 1933 г., а колькасць комсамольцаў — з 19-ці ў 1928 г. да 30 проц. у 1933 г.

За гады першай пяцігодкі з ВНУ і ВТНУ выпушчана 170 тысяч спецыялістаў, а за адзін 1933 г. — 37 тыс. спецыялістаў.

У рэзультаце колькасць спецыялістаў з вышэйшай асветай па ўсіх галінах павялічылася з 179 тыс. у 1928 г. да 303 тыс. на пачатак 1933 г.

ПА ТЭХНІКУМАХ

	1928 г.	1933 г.
Колькасць тэхнікумаў	1033	3522
Колькасць студэнтаў у тэхнікумах (у тысячах)	188	672

Процант рабочых у складзе вучняў тэхнікумаў павысіўся з 25 проц. у 1928 г. да 41 проц. у 1933 г., а процант комсамольцаў з 36 проц. у 1928 г. да 42 проц у 1933 г.

За гады першай пяцігодкі выпушчана з тэхнікумаў 300 тысяч чалавек, а за адзін 1933 г. — 153 тыс.

У рэзультаце лік спецыялістаў з сярэдняй тэхнічнай асветай у СССР павысіўся з 313 тыс. у 1928 годзе да 669 тыс. к пачатку 1933 года.

Гэтыя лічбы гавораць аб аграмадных колькасных зрухах. Але яшчэ больш значныя якасныя змены ў падрыхтоўцы нашых спецыялістаў, павышэнні якасці вучобы, зняцці тэхнічнай кваліфікацыі з палітычнага твару нашых гаспадарча-тэхнічных кадраў.

У 1928 годзе большасць вышэйшых навучальных устаноў не былі тэхнічнымі. Няправільна разумеўся політэхнізм, падрыхтоўвалі ўніверсальнага спецыяліста, які ведаў зачастую што хочаце, але менш за ўсё тэхніку той справы, куды ён пасылаўся. Мы арудуем змяніўшы сістэму работы ВТНУ, вытворчую практыку і спецыялізавалі ВТНУ. Не абышлося, зразумела, без некаторых перагібаў. За частую занадта звужвалі рамкі падрыхтоўкі спецыялістаў. Але асноўны напрамак перабудовы быў правільны. Я не хачу гэтым сказаць, што ўсё абстаіць добра. У ВНУ і ВТНУ ўсё яшчэ якасць навучання кульгае, у прыватнасці, гэта адносіцца да падрыхтоўкі архітэктурных кадраў, якія набываюць у другой пяцігодцы асаблівае значэнне. Зараз мы павінны больш налегчы на **якасць** вучобы, на якасць падрыхтоўкі.

Калі вы прымеце пад увагу, што колькасць выпускаемых спецыялістаў дае ўжо пэўнае **нарастанне,** што ў 1934-35 гг. мы атрымаем рэзультаты набору арганізаванага ў 1931-32 гг., то стане ясным, як мы ў колькасным і якасна палепшылі падрыхтоўку кадраў.

Гістарычныя лозунгі тав. Сталіна: **«Тэхніка ў перыяд рэканструкцыі вырашае ўсё», «большэвікі павінны аўладаць тэхнікай»** выклікалі аграмадны энтузіязм і цягу да ведаў з боку комуністаў, перадавых беспартыйных рабочых і калгаснікаў. У рэзультаце аграмаднай арганізацыйнай работы нашай партыі Совецкі Саюз ператварыўся ў краіну **масавай тэхнічнай асветы.** Мы пачынаем цяпер пажынаць багатыя плады гэтых гістарычных дырэктыў тав. Сталіна і ўваходзім у другую пяцігодку з умацаваным касцяком маладых пролетарскіх камандных кадраў, асабліва ў прамысловасці.

У буйнай прамысловасці лік спецыялістаў з закончанай вышэйшай асветай узрос з 13,7 тыс. у 1928 г. да 50,7 тыс. у 1933 г.; з закончанай сярэдняй асветай — з 10,5 тыс. у 1928 годзе да 71,8 тыс. у 1933 годзе; а ўсяго спецыялістаў разам з практыкамі — з 100 тыс. у 1928 г. да 331 тыс. у 1933 г.

Маладыя спецыялісты, **скончыўшыя ВНУ і тэхнікумы ў гады першай пяцігодкі, складаюць больш паловы ўсіх спецыялістаў.** На варштатабудаўніцтву—66 проц., авіяпрамысловасці—70 проц., нафце—68 проц., вугалю—58 проц., аўтатрактарнай прамысловасці—60 проц. і т. д.

На камандных пасадах на вытворчасці — сярод начальнікаў цэхаў, іх памеснікаў і начальнікаў змен маладыя спецыялісты складаюць: у чорнай металургіі — 65 проц., аўтатрактарнай—62 проц., будаўнічай—62 проц., электрапрамысловасці і энергетыцы — 64 проц.

На аўтазаводзе імя Сталіна палова ўсяго камандняга складу вылучана з рабочых у гады першай пяцігодкі.

Мы ўжо сёння маем такія факты, калі цэлыя заводы, цэлыя цэхі кіруюцца толькі маладымі спецыялістамі, калі многія з нашых маладых спецыялістаў працуюць не горш, а лепш не толькі за старых спецыялістаў, але і за некаторых замежных.

Я мог-бы прывесці прыклад з нашай паездкі з т. Орджанікідзе на пуск Сталінагорскага хімкамбіната. Мы бачылі там аднаго маладога прафесара, скончыўшага ВНУ толькі ў 1931 г. Ён заслужыў званне прафесара пасапраўднаму, не так, як часамі атрымліваюць званне прафесара пашармака, ліпавы (**смех**), а зарабіў гэта званне пасапраўднаму. Дык вось гэты т. Гальперын, калі ён працаваў на Бярэзнікаўскім азотным заводзе разабраў, абнавіў каталізатары, змантаваў і пусціў у эксплаатацыю выключна сіламі совецкіх спецыялістаў адну з калон сінтэза. Амерыканцы, устанавіўшыя гэту калону, аказаліся не ў сілах пусціць яе таму, што там былі канструкцыйныя недахопы. Тав. Гальперын, разам з маладым інжынерам Манасовічам змяніў канструкцыю калоны і здолеў яе пусціць. Сёння яна працуе з поспехам. З Японіі яго запрасілі ў якасці кансультанта на пабудову новага завода. Але гэты малады совецкі прафесар далікатна адказаў, што яму некалі, у нас свае работы хопіць (**смех, апладысменты**).

Можна было-б прывесці рад найярэйшых прыкладаў талантлівых людзей, вырасшых за гады пяцігодкі. Я мог-бы сказаць аб т. Бутэнка, — член партыі з 1931 г., у нядаўнім мінулым — слесар, — скончыўшым ВТНУ ў 1928 г. За 5 год гэты Бутэнка прайшоў практычны стаж — ад зменнага інжынера, памочніка начальніка, начальніка доменнай печы, галоўнага інжынера завода імя Сталіна да пасада тэхнічнага дырэктара буйнейшага металургічнага завода ў Данбасе.

Орджанікідзе: У дадатак ён замяняе зараз дырэктара завода тав. Манаенкава.

Саркісаў. Вельмі добра спраўляецца.

Каганові́ч. І вельмі добра. Вось яшчэ дырэктар акумулятарнага трэста т. Адміральскі, які нарадзіўся ў 1902 г., у нядаўнім мінулым актыўны комсамольскі работнік. Гэты дырэктар скончыў ВНУ ў 1928 годзе, вырас на вытворчасці і зараз з поспехам спраўляецца са складаным пастом дырэктара акумулятарнага трэста.

Можна было-б прывесці тысячы прыкладаў, калі ўчарашнія **чорнарабочыя** сталі брыгадзірамі, майстрамі і тэхнікамі. Гэта — рэзультат той барацьбы, якую партыя разгарнула за пролетарскія кадры.

(ПРАЦЯГ НА 4 СТАР.).

Працяг даклада тав. Л. М. КАГАНОВІЧА

2. ЯК ПАРТЫЯ ЎМАЦОЎВАЛА РАБОТНІКАМІ КАЛГАСНУЮ ВЁСКУ

Асабліва неабходна спынніца на кадрах для сельскай гаспадаркі. Тут, таксама як у прамысловасці, расцвітала падрыхтоўка пашых тэхнічных кадраў:

ПАДРЫХТОЎКА КАДРАЎ ДЛЯ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ

	1928 г.	1933 г.
Колькасць с.-г. ВНУ і ВТНУ	30	116
Колькасць с.-г. тэхнікумаў	204	928
Колькасць студэнтаў у с.-г. ВНУ і ВТНУ (у тыс.)	29	99
Колькасць студэнтаў у с.-г. тэхнікумах (у тыс.)	30	121

Выпушчана з с.-г. ВНУ за гады першай пяцігодкі 29 тыс., а ў 1933 годзе—6.000; з с.-г. тэхнікумаў за гады першай пяцігодкі — 67 тыс., а за 1933 год—31 тыс.

У рэзультаце, калі ў пачатку першай пяцігодкі на вытворчасці ў сельскай гаспадарцы па даных Дзяржплана СССР працавала каля 18.000 спецыялістаў з закончанай в.-г. асветай, то к канцу 1933 года працуе на вытворчасці (уключаючы раённыя зямельныя органы) каля 126 тыс. спецыялістаў з закончанай вышэйшай і сярэдняй с.-г. асветай, г. зн. рост у 7 раз.

Вядома, у нас яшчэ далёка не задаволена патрэбнасць у тэхнічных кадрах для сельскай гаспадаркі. Але ў сельскай гаспадарцы з асаблівай вострасцю ў апошнія гады стала пытанне аб кіруючых арганізатарскіх кадрах.

Калі прамысловасць сама магла быць крыніцай папаўнення сваіх кадраў, то ў сельскай гаспадарцы гэтыя магчымасці да апошняга часу былі вельмі абмежаваны, калі не сказаць больш.

Вёсцы, стаўшай пад сцяг соцыялізма, павінен быў дапамагчы горад, і гэта наша партыя ажыццёміла. Распыленая раней вёска не магла вылучыць са свайго асяроддзя патрэбнай колькасці новага тыпу арганізатараў для буйнага соцыялістычнага земляробства, якім з'яўляюцца калгасы, МТС і саўгасы. Адсюль выцякала задача — даць вёсцы людзей з боку, даць ёй моцных работнікаў з пролетарскага горада, якія маглі-б стварыць у вёсцы моцную партыйную арганізацыю, маглі-б выкаваць большэвіцкоў, выхаваць кадры і стварыць рэзервы, з якіх можна было-б у далейшым зэрпаць кіруючы склад для нашай соцыялістычнай сельскай гаспадаркі.

Вы ўсе помніце пасылку 25 тыс. рабочых. Гэта быў першы крок па нерпых парах, яны дапамаглі і адыгралі вялікую ролю, але гэта аказалася недастатковай сілай для замацавання вёскі на новых калгасных шляхах.

І вось т. Сталін, паленінску аба гуліўшы становішча ў вёсцы, высунуў задачу—стварыць у вёсцы новую арганізацыю—палітаддзелы, паслаць туды з горада праверанных, моцных людзей, якія маглі-б вырашаць задачы, што стаяць перад партыяй.

Калі мы пачалі толькі арганізацыю палітаддзелаў, у некаторых таварышоў былі сумненні—як-ка гэта зверху пасылаюцца работнікі ў вёску, як гэта ўспрыме сялянства. **Сёння мы чуем магутны голас, які ідзе ад чыстага сэрца дзесяткаў мільёнаў сялян, якія літаральна васпяваюць палітаддзельцаў, як большэвікоў-арганізатараў, як людзей, аб'яднаўшых калгасную масу на барацьбу за большэвіцкія калгасы, за заможнае культурнае жыццё калгаснікаў (Бурныя апладысменты).**

Калі мы пачалі падбраць работнікаў у палітаддзелы, тав. Сталін спецыяльна ўказваў — глядзіце, каб тут не было ў вас згушчэння мабілізацкага падыходу; адбірайце персанальна; уважліва вывучайце кожную кандыдатуру ў паасобку; падбірайце буйных людзей, не лічыцеся з тым, што ўстановы і арганізацыі будуць скарджацца, шчыра падбірайце, бо вы пасылаеце людзей на вялікую перабудову вёскі.

Для таго, каб адабраць адзнаго палітаддзельца, нам прыходзілася прапускаць сцяц, а часамі і дзесяць чалавек. І не таму, што гэтыя людзі былі дрэнны, а таму, што ў палітаддзелы мы падбралі самых лепшых. Бывала, прыходзілі людзі, літаральна плачалі, за што вы мяне бракуеце ў палітаддзел? Вы выклікалі мяне, ну, не хочаце паслаць начальнікам, памкіце намеснікам, памочнікам, інструктарам. Вакол пасылкі ў палітаддзелы разгарнуўся літаральна дух сярод комуністаў.

Мы сфармавалі адну групу з армейскіх работнікаў. Армія дала нам першую групу начальнікаў палітаддзелаў у 300 чалавек. Гэта быў першы атрад моцных выдатных людзей. **(Апладысменты).**

У вёску паслана звыш 18 тысяч палітаддзельцаў, з іх: 58 проц. з рабочых; 35 проц. з партстажам да 1920 года; начальнікаў палітаддзелаў з партстажам да 1920 г.—79 проц.; 45 % начальнікаў палітаддзелаў маюць вышэйшую партыйную або вышэйшую агульную асвету; 46 проц.—сярэднюю асвету.

Памма работнікаў палітаддзела кожная вобласць пасылала людзей на сяло, у калгасы. Паводле пяцёх даных 23 вобласці паслалі каля 40-50 тысяч работнікаў у вёску. Пасылка палітаддзельцаў Цэнтральным Камітэтам пашпіруюцца вобласці і краі.

З начальнікаў палітаддзелаў не менш паловы гэта — людзі з Масквы і Ленінграда. Масква і Ленінград — гэтыя дзве сталіцы з гонарам выканалі свой абавязак перад краінай. **(Апладысменты).**

3. ЦК УМАЦОЎВАЎ РАБОТНІКАМІ СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧЫЯ І АДДАЛЁНЫЯ КРАІ

Асобна трэба адзначыць дапамогу мясцам умацаваннем іх работнікамі. Паміж з'ездамі Цэнтральны Камітэт размеркаваў 45 тыс. работнікаў (паміж XV і XVI з'ездамі было размеркавана толькі 10 тыс. работнік ў). Павялічэнне лічбы размеркаваных не адбіжа на якасці пасылаемых. Больш 70 проц. размеркаваных уступілі ў партыю пасля пазней 1920 г.; звыш паловы—у мінулым рабочым; 62 проц. пасланых маюць закончаную вышэйшую і сярэднюю асвету.

Атрымалі работнікаў ад ЦК: Урал атрымаў 2.238 работнікаў; Вахоўная Сібір — 2.242; Усходняя Сібір — 1.381; Далёкі Усход — 1.913; Сярэдняя Азія — 1.927; Казахстан — 2.261. Такім чынам, вышэйшы край і рэспублікі атрымалі амаль 12 тыс. работнікаў. Нагад у іх узята (цяжучасць, перакідка і інш.) 1.800 работнікаў.

Многа работнікаў накравана ў асноўныя сельскагаспадарчыя раёны: Украіна атрымала 5.581 работніка; Паўночны Каўказ—3.197; Нізкая Волга — 2 140; Сярэдняя Волга — 1.625; ЦЧВ — 1.788. У шэльч гэтыя раёны атрымалі звыш 14 тыс. работнікаў; узята ў іх 3 тыс. Вобласць, у якую мы пасылалі лепшых людзей, — гэта Закаўказье. Цэнтральны Камітэт мае магчымасць канстатаваць, што за апошнія гады ва ўсіх рэспубліках Закаўказзя выпрабоўваюцца з вялікім поспехам новыя людзі. **(Апладысменты).**

Цэнтральны Камітэт займаўся пытаннем забеспячэння кваліфікаванымі рабочымі. У прыватнасці пад кіраўніцтвам ПК комсамол і профсаюзы правялі рэшкую работу па мабілізацыі людзей на новабудовы Урала. Або вось зараз арганізуюцца новыя тэкстыльныя камбінаты, і ЦК праводзіць мабілізацыю тэкстыльшчыкаў Маскоўскай і Іванаўскай абласцей для пасылкі іх і ў Сярэднюю Азію, і ў Заходняю Сібір. Толькі за тры гады наш комсамол правёў мабілізацыю 66 тысяч рабочых па прадпрыемствы Урала-Кузбаса, 36 тысяч у Донбас, 7 тысяч на Сталінградскі трактарны, 10 тысяч на метабуд, 6 тысяч у саўгасы суха, 20 тысяч на лесазагатоўкі, звыш 3 тысяч у ДУК і т. д.

Даволі ўсяго гэтага, каб атрымаць прадстаўленне аб тым агромадным размаху арганізацыйнай работы, якая характарызуецца не толькі падрыхтоўкай, ростам і размеркаваннем кадраў, але і стварэннем новых прадпрыемстваў, укараненнем новых прадпрыемстваў і т. д.

Зразумела, у адносінах падрыхтоўкі і размеркавання работнікаў у нас яшчэ шмат недахопаў. Яшчэ не знайшла практыка агульнага мабілізацкага падыходу да падбору работнікаў. Персанальнага падбору, уліку персанальнай здольнасці работнікаў яшчэ недастаткова.

Важнейшымі недахопамі з'яўляюцца: адсутнасць пільнага падбору людзей, персанальнай ацэнкі гэтых людзей не па дыплому, а па практычнай работе; няўменне падняць і выкарыстаць тых людзей, якія заслугоўваюць гэтага цыкучэння; пазбавальваючая якасць работы многіх ВНУ і асабліва тэхнікумаў.

А галоўнае — гэта хваробы, ускрытыя Цэнтральным Камітэтам на прыкладзе вугольнай прамысловасці і чыгуначнага транспарту — **застраванне аграмаднай колькасці людзей у канцылярыях.**

Работа, праробленая па перакідцы спецыялістаў з канцылярыі на вытворчасць у вугольнай прамысловасці і на чыгунках дала ўжо ад чувальныя рэзультаты.

Так, напрыклад, у Данбасе працавала па 1 сакавіка 1933 года горных інжынераў 643, з іх на ўчастках усяго 26 чал.; на 1 кастрычніка працавала ўжо 854 чал., з іх на ўчастках 350 чал. Лік працуючых на ўчастках вырас у 13 раз. Усяго інжынераў і тэхнікаў на ўчастках працавала на 1 сакавіка 1933 года 228 чал., а на 1 кастрычніка—1.120 чал.—рост у 5 раз.

На чыгунках працавала па 1 ліпеня 1933 года ў асноўных дэпо 446 інжынераў, на 1 кастрычніка —976 інжынераў. Усяго працавала на 1 ліпеня ў дэпо, вагонных участках, на станцыях, у дыстанцыях шляху і сувязі 1.012 інжынераў і 7.575 тэхнікаў, а на 1 кастрычніка працуюць 3.095 інжынераў і 14.342 тэхнікі. г. зн. лік інжынераў, працуючых у нізавых звеннях чыгуначнага транспарта, вырас у тры разы, тэхнікаў у два разы.

Вопыт шахт і чыгунак паказвае, якія велізарныя магчымасці ёсць у гэтых адносінах ва ўсіх астатніх галінах народнай гаспадаркі.

Але мала толькі перакінуць людзей у нізавыя звенні. Чаму рэзультаты скарачэння штатаў аказаліся ў нас раней не досыць эфектыўнымі? Гэта таму, што ты скарачаліся **без карэннай і глыбокай перабудовы зверху данізу, без змены арганізацыйнай сістэмы і справаздачнасці.** І толькі пры апошнім скарачэнні штатаў, якое было праведзена па даручэнню ЦК органамі ЦКК-НК РСІ, пачата, праўда, не досыць рашуча, змена самой структуры апаратаў.

Ройзенман: Правільна.

4. ЗНАЧЭННЕ АРГАНІЗАЦЫЙНАГА ПЫТАННЯ НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ БУДАЎНІЦТВА СОЦЫЯЛІЗМА

Мы прайшлі вялікія гады слаўнай барацьбы і мы падводзім па XVII з'ездзе вынікі нашым перамогам. Падводзім гэтыя вынікі не для ўпаення перамогамі, якімі заканна ганарымся. Гэтыя вынікі мы падводзім не з пункту гледжання акадэмічнага, гістарычнага, а як армія байцоў-рэволюцыянераў. Мы аглядваем пройдзены шлях для таго, каб на ўроках мінулага праверыць і адтачыць нашу зброю для надыходзячых вялікіх баёў.

Нашы дасягненні дазваляюць нам узмацніць барацьбу з арганізацыйнымі недахопамі. Мы павінны замацоўваць заваяванае ў гады першай пяцігодкі, павысіць якасць работы і пафас будаўніцтва дапоўніць пафасам асваення.

Вялікі быў арганізацыйны размах нашай работы. Пры гэтым пеміпучы былі прарохі, як і на новапабудаваным заводзе, у паасобных кутках накаплялася смецце, адкіды вялікай будоўлі. Цяпер неаб ходна пачысціцца, прывесці ўсё ў парадак.

Мы павінны рэзка ўскрыць нашы недахопы. Крытыка іх нікольскі не змяншае нашых дасягненняў. Наадварот, яна паказвае ўсведамленне ўласнай сілы, упэўненасці ў моцнасці, устойлівасці арганізма пролетарскай дыктатуры.

У тэзісах, прапануемых XVII з'езду гаворыцца:

«Цяпер, калі генеральная лінія партыі перамагла, калі палітыка партыі праверана жыццём, на вопыце не толькі членаў партыі, але і мільёнаў сялян, і прапоўных сялян, на ўвесь рост паўстае задача падняцця арганізацыйнай работы да ўзроўню палітычнага кіраўніцтва. Арганізацыйнае пытанне, астаючыся надпарадкаваным пытанням палітыкі, набывае ўсё-ж з прычыны гэтага для далейшых поспехаў соцыялістычнага будаўніцтва **выключнае** значэнне».

Ленін і Сталін не раз указвалі, што гвозд арганізацыйнага пытання **ў падборы людзей і праверцы выканання.** Гэтыя дзве праблемы непарыўна адна з другой звязаны. Правільнае вырашэнне іх намыслі ма без перабудовы структуры, сістэмы работы нашых совецкіх і партыйных органаў.

Пры функцыяналцы, выклікаючай абязлічку, нельга паставіць чоткага аперацыйнага кіраўніцтва, нельга лабіцца строгай асабістай адказнасці, а, значыць, нельга забяспечыць сістэматычнай і дэтальнай праверкі выканання. Пры функцыяналы і заблытанай структуры развіваюцца штаты сярэдніх і вышэйшых звенняў. Сёння перакінуць работнікаў на вытворчасць, заўтра іх зноў перацягнуць у раздуваючыя канцылярыі.

Вось чаму мы ставім усе арганізацыйныя пытанні цэласна, комплексна: і падбор людзей і праверку выканання, і змяненне арганізацыйнай структуры, і ліквідацыю канцылярска-бюракратычных метадаў кіраўніцтва.

Трэба адкрыта сказаць, што канцылярска-бюракратычныя метады кіраўніцтва, звядзенне кіраўніцтва да агульных загадаў, нежаданне злучыць адміністрацыйнае кіраўніцтва з гаспадараннем па сутнасці, функцыяналізма, — усё гэта з'яўляецца спадчынай буржуазных метадаў кіравання Многія з нашых; хоць і чэсных, добрых гаспадарнікаў і кіраўнікоў, не разумеюць карэннай розніцы паміж пастаноўкай кіравання ў нас і пастаноўкай кіравання ў буржуазных краінах.

Нідзе ў свеце арганізацыйнае пытанне не стаіць і не можа стаяць так востра і так шырока, як яно стаіць у нас. Капіталіст не ці кавіцца, не ведаў і не ведае самой праблемы арганізацыі эканомікі краіны, як адзінага цэлага, бо гэта супярэчыць самой прыродзе капіталізма. Нават арганізаванасць асобнага капіталістычнага прадпрыемства або трэста сугуба аднос на, іменна таму і праваліліся ўсе утапічныя спробы дробна-буржуазных ідэолагаў Оуэна і іншых унесці элементы арганізаванасці ў капіталістычную гаспадарку, не ўстраняючы самога капіталізма. Іменна таму праваліліся ўсе спробы соцыял-фашыстаў ды іх дапаможнікаў—нашых правых апартуністаў угрупаваць, на аснове развіцця манаполій, картэляў і трэстаў, тэорыю «арганізаванага капіталізма». Фактычна мы бачым, што спробы капіталістаў аслабіць анархію вытворчасці шляхам арганізацыі манаполій, картэляў і трэстаў ні да чога не прыводзяць.

Буржуазны дзяржаўны апарат, буржуазныя міністэрствы не кіруюць гаспадаркай. Буржуазны дзяржаўны апарат адыгрывае ў перавазнасці ролю паліцэйска-рэгулятыўную, ахоўваючы інтарэсы капіталістаў супроць рэволюцыйных рабочых, а кожным **прадпрыемствам** кіруе сам капіталіст, у той час як у нас, у грамадстве соцыялістычным, іменна дзяржава ажыццяўляе **адзінства палітычнага і гаспадарчага кіраўніцтва.**

Самая пастаноўка ў нас арганізацыйнага пытання з асаблівай вострасцю выцякае са зместу дыктатуры пролетарыята, са зместу задач будаўніцтва соцыялізма. Ленін і Сталін не раз падкрэслівалі, што пасля перамогі над буржуазіяй, пасля заваявання ўлады галоўная і самая трудная задача — гэта задача арганізацыі новых грамадскіх адносін, задача арганізацыі планамернай вытворчасці і размеркавання прадуктаў, неабходных для існавання дзесяткаў мільёнаў людзей.

В. І. Ленін гаварыў: «Для паспяховага кіравання неабходна. АПРАЧА ўмення перамагаць, апрача ўмення перамагчы ў грамадзянскай вайне, умение практычна АРГАНІЗАВАЦЬ. Гэта — самая трудная задача, бо справа ідзе аб арганізацыі пановаму самых глыбокіх эканамічных асноў жыцця дзесяткаў і дзесяткаў мільёнаў людзей. І гэта — самая ўдзячная задача, бо толькі ПАСЛЯ ня РАШЭННЯ (у галоўных і асноўных рысах) можна будзе сказаць, што Расія СТАЛА не толькі совецкай, але і соцыялістычнай рэспублікай» (том 22. стар. 442).

Тав. Сталін паказаў на з'ездзе, наколькі ў сучасны момант, калі мы стварылі тысячы новых буйнейшых прадпрыемстваў, калі гігантыі выраслі запатрабаванні мас, калі ад можнага работніка патрабуюцца найглыбейшыя веды дэталяй работы, калі соцыялістычны ўклад «з'яўляецца безраздзельна пануючай, адзіна камандуючай сілай на ўсёй народнай гаспадарцы», — наколькі востра высоўваюцца пытанні арганізацыі.

Ва ўмовах, калі соцыялістычная гаспадарка выступае адзінай камандуючай сілай не на паасобных участках, а на ЎСІМ полі гаспадарання, кепская арганізацыйная пастаноўка справы, кепскае кіраванне, кепская праверка выканання прамым і непасрэдным чынам тармозяць развіццё пралетарскіх сіл, паспяховае выкананне задачы асваення і тэхнічнай рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі.

Калі ў першай пяцігодцы гісторыя не давала нам ніякіх аргументаванняў у правядзенні індустрыялізацыі краіны, то ў другой пяцігодцы ў НАС НЯМА НІЯКІХ АДТЭРМІНОВАК У СПРАВЕ АСВАЕННЯ, АЎЛАДАННЯ НОВАЙ ТЭХНІКАЙ, АСВАЕННЯ І ЎМАЦАВАННЯ НОВЫХ ФОРМ ЖЫЦЦЯ. А поспехі гэтай справы залежаць толькі ад нашай арганізаванасці, толькі ад нашай арганізацыі справы ў працы ад арганізацыі справы ў прамысловасці, у транспарце, у сельскай гаспадарцы, гандлі і т. п. Тав. Сталін заявіў на з'ездзе, што ад нказнасць за нашы прарывы і недахопы ў рабоце кладзецца з пэдагога часу на дзевяць дзесятых не на «аб'ектыўныя» ўмовы, а на нас самых, і толькі на нас.

Арганізацыйнае пытанне займала буйнейшае месца на ўсіх этапах нашага будаўніцтва, а зараз яно набывае яшчэ БОЛЬШ ГЛЫБОКІ І РАШАЮЧЫ ХАРАКТАР. Ва ўвесь рост паўстаюць арганізацыйныя пытанні іменна пазе — у эпоху пабудовы бясклассавага соцыялістычнага грамадства. Калі брыгада ў калгасе або аддзяленні калгаса дрэнна арганізаваны, калі там дрэнна арганізавана праца, калі нераўнамерна скарыстоўваюцца сродкі вытворчасці, калі кіраўнік гэтай брыгады або саўгаса не ведае толкам сваёй справы, не ракуюе ўстройства новых сучасных земляробчых машын, калі трактар, камбайн для яго «цёмная сіла», то гэта б'е па ўмацаванню соцыялістычнага земляробства, тармозіць арганізацыю соцыялістычных форм гаспадаркі, тармозіць пабудову соцыялістычнага грамадства. Сэнс і змест работы нашай партыі зараз, калі на створаным фундаменце соцыялістычнай эканомікі ідзе будоўля ўсяго будынку соцыялізма, у тым і заключаецца, каб непасрэдна арганізаваць гэту будоўлю, арганізаваць для гэтага масы.

Падмацаваць арганізацыйную работу партыі да ўзроўню яе палітычнага кіраўніцтва — гэта значыць забяспечыць неабходны тэмп пераўтварэння сацыялістычнай партыі у жыццё неабходны тэмп пабудовы соцыялістычнага грамадства. Іменна ад ліквідацыі арганізацыйнага адставання будзе залежаць і быстрэйшае асваенне новай тэхнікі, новых прадпрыемстваў, іменна ад гэтага будзе залежаць арганізацыйнае ўмацаванне калгасаў і ператварэнне іх у вышэй культурнага і заможнага соцыялістычнага жыцця.

Да свядомасці вожнага калгасніка павінна дайсці, што арганізацыйнае пытанне стаіць не як выпрацаванне мадэльнага пастаўнага механізма. АРГАНІЗАЦЫЙНАЕ ПЫТАННЕ ПАСТАЎЛЕНА ЦЭНТРАЛЬНЫМ КАМІТЭТАМ ПА ПРЫНЦЫПІВЕ ТАВ. СТАЛІНА ТАКСАМА ПЫРОКА ЯК ПЫРОКА БЫЛА РАЗГОРНУТА БАРАЦЬБА ЗА ГЕНЕРАЛЬНУЮ ЛІНІЮ НАШАЙ ПАРТЫІ.

Генеральная лінія партыі перамагла. Гэта лінія для ўсіх. У адпаведнасці з ёю пацяцілася і арганізацыйная работа, але яна адстала, не трэба пацяцілуць да ўзроўню палітычнага кіраўніцтва, да ўзроўню грандыёзнага маштаба задач другой пяцігодкі.

Мы павінны разглядаць арганізацыйнае пытанне не толькі з пункту гледжання перабудовы тых ці іншых верхавінных арганізацый, але і з пункту гледжання порабудовы ўсіх арганізацый, пачынаючы з завода, фабрыкі, калгаса, МТС, магазіна, больніцы і т. д., г. зн. в тых звеннях, дзе вырабляецца матэрыяльнае дабро, дзе творыцца сапраўднае жыццё.

Прыкладам такой пастаноўкі пытання з'яўляецца рашэнне Цэнтральнага Камітэта аб вугольнай прамысловасці.

II. Перабудова совецка-гаспадарчых органаў кіраўніцтва

1. АРГАНІЗАЦЫЙНЫЯ ПЫТАННІ Ў ЦЯЖКАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ

Не буду тут падрабязна спынніца на ўсёй пастаноўцы пытання аб вугалі. Ясна адно, што ў гэтым пытанні, як ні ў якім другім, было забяспечана сувязь паміж палітычна-гаспадарчай задачай і арганізацыйным яе вырашэннем.

Палітычная і эканамічная задача перамагання такога вузкага месца, як адставанне вугольнай прамысловасці, была забяспечана Цэнтральным Камітэтам такімі арганізацыйнымі мерапрыемствамі, як удар па канцылярска-бюракратычнаму метаду кіраўніцтва, як перакідка кваліфікаваных інжынерна-тэхнічных сіл непасрэдна на вытворчасць, як барацьба з функцыяналізмам, абязлічкай у кіраванні і ўраўнілаўкай у заработнай плаце. Гэтыя арганізацыйныя мерапрыемствы, як відома, выйшлі далёка за рамкі пастановы аб Данбасе. Гэтыя мерапрыемствы з'яўляюцца асноўным арганізацыйным звяном за ўсёй сістэме перабудовы нашай гаспадарчай, дзяржаўнай і партыйнай работы. Гэта ўжо даказана. Справа не ў тым, каб скараціць штаты і потым праз паўгода яны зноў разбухлі. Трэба змяніць сістэму.

Партыя доўга вазілася з Данбасам, але з прычыны таго, што да каранных арганізацыйных пытанняў не дахопілі, вось заставаўся на месцы. Дробнасць мерпрыемстваў выпрацоўкі даходзіла да абідных размераў. Гэтыя нормы вылічваліся дзесяткамі тысяч. Напрыклад, толькі ў адным чырвонагвардзейскім рудакіраўніцтве іх было да дванаццаці тысяч. Вынікала «нармізаваніка» прадуктывізвалі для адных забойшчыкаў на адбойных малатках 1.500 норм. Нават для такой простай аперацыі, як перанос пампкавай канцевра, было прадугледжана звыш 400 норм. Рабочыя, вядома, не маглі вешаць сваіх норм і расцэнак за тону або за вагончык.

Выяўляўся безупынцае брыгадыра, дзесятніка і начальніка ўчастка, спробы ўзняць прафесій і функцыяналізма ў кіраўніцтве шахты, дарэчыцца да абсурда. Калі дзесятніку і начальніку ўчастка не хапала было рамантаваць урубную машыну, ён павінен быў прасіць у заработчыка аддзела механізацыі шахт, які сядзеў на паверхні, каб той прыслаў яму слесара. Калі вагаметкі забураліся і шлях псаваўся, то начальнік участка павінен быў прасіць заработчыка шляхавай гаспадаркі, які таксама сядзеў на паверхні, каб той прыслаў рамонтных рабочых. ЛЕПШЫЯ ВЫКЛЮЧЫЛІСЯ ТЭХНІКІ СЯДЗЕЛІ Ў ТРЭСТАХ РУДАКІРАЎНІЦТВАХ І ШАХТАКІРАЎНІЦТВАХ. У якасці «дапамогі» лепшых работнікаў перакідалі ў канцылярыі. Гэта вылілася «навыпіхом».

Вы ведаеце першае рашэнне ЦК і потым наступнае палажэнне аб шахце, рудакіраўніцтве і трэсце. У гэтым палажэнні мы пачалі з брыгадыра і дзесятніка, з перапачатковай клетачкі вытворчасці, далі правы начальніку участка, вы рашылі пытанне пармавання працы, заработнай платы, рамонта механізмаў і інш. Арганізацыйнае вырашэнне ў вугольнай прамысловасці грунтоўна і глыбока. Рэзультаты відомы.

На прыкладзе вугалю відаць, як трэба скарачаць штаты, змяняць структуру і якіх рэзультатаў можна дасягнуць. Вось прыклады.

На шахце «Ільіч» (Калінаў-вугаль) на 1 сакавіка было 171 служачы, а на 1 студзеня 1934 г. — 84, удвая менш. А толькасць інжынерна-тэхнічных работнікаў, працуючых унізу ў забоі, павялічылася на 13 чалавек. Пры скарачэнні служачых удвая шахта дала вугалю ў параўнанні з 1932 годам удвая больш: замест 157 тысяч тон — 286 тысяч тон, перавыканаўшы план на 12 процантаў.

Рэзка скарацілі справаздачнасць. Калі да рашэння ЦК шахта павінна была даваць па 64 формах 51.5 тысячы паказальнікаў у месяц, то зараз справаздачнасць скарочана ў сем раз. ПОСАК СТАЛА МЕНШ. ПАЛЕРЫ ПОЎНЮЦЬ МЕНШ, А ВУГАЛЮ ЗДАБЫВАЮЦЬ БОЛЬШ. У мае фактычная сярэднясутачная здабыча украінскага Данбаса была 121 тысяча тон, у лістападзе — 134 тысячы, рост на 11 проц. У маі пікавыя часцы асноўнага вугольнага работага была 36 тон, у кастрычніку — 42 тоны, рост на 16 процантаў. Узнялася заработная плата рабочых: у маі было 118 руб., у кастрычніку 150 руб., рост на 18 процантаў.

Ліквідацыя функцыяналізму рэзка знізіла аварыі механізмаў. Напрыклад, на шахце «Ільіч» (Калінаў-вугаль) у 1932 годзе была 31 буйная аварыя ўрубавых машын, у 1933 г. — 19, у 1932 годзе было 14 аварый канвеерных прывадоў, у 1933 г. — 6, прычым большасць аварый 1933 года атносіцца да першага паўгоддзя, у другім паўгоддзі іх амаль няма. На гэтай жа шахце існаваў спецыяльны аддзел узбагачэння вугалю. Начальнік участка амаль не адказваў за якасць вугалю. Зараз аддзел ліквідаваў і зольнасць вугалю рэзка павялічылася.

Ліквідацыя аддзела ўзбагачэння ўзбагаціла вугаль. На адзін аддзел мы «бяднейшы», затое шахта стала багацей вугалем. **(Смех).**

Вядома, і ў вугольнай прамысловасці перабудова яшчэ не скончана. І там ёсць яшчэ ряд шахт і трэстаў, аб якіх можна сказаць: гані прыроду ў ківеры, яна ўвойдзе ў вакно. Я кажу ў лепшым выпадку аб бюракратычнай прыродзе. Там патрэбна яшчэ барацьба, патрэбна праверка выканання, і захапляцца нельга, але ўсё-ж мы можам сказаць, што вугольная прамысловасць у арганізацыйным пытанні апераздзе ўсёй астатняй прамысловасці.

Ці ўлічыла ўся прамысловасць урокі вугалю? Я павінен адкрыта сказаць, што ўрокі Данбаса ўлічаны нашай прамысловасцю слаба і незадавальняюча.

Нашы заводы працуюць, зразумела, лепш, чым працавалі Данбас да рэарганізацыі. Тут больш культуры, рабочыя лепш арганізаваны. Але арганізацыйнай бяспечнасці і бязадказнасці ў кіраўніцтве многа і трэба пачаць праводзіць работу на ўсёй прамысловасці па прыкладу вугалю. Гэта дасць магчымасць для далейшага максімальнага скарыстання наяўных вялікіх працуючых магутнасцей.

Калі ўзяць кіраўніцтва заводам і яго аддзелы з шахам, то мы павінны сказаць, што там асталася яшчэ функцыяналізм, як гэта было на шахце. Пэх, калі параўнаць яго з участкам на шахце, не займае таго месца, якое ён павінен займаць, якое займае зараз участак у шахце. Кіраўніцтва завода да гэтага часу яшчэ настольнікі грамоцка, што яно замест дапамогі давіць часта на шкі. Паміж кіраўніцтвамі, функцыяналізм; сектарамі і цэхамі абвяшчаецца бясконцая перапіска, якая перашкаджае — начальніку цэха. Больш таго, у самых цэхах часта спалучаюцца чыста фармалізм адносіны паміж начальнікам цэха і яго апаратам.

Возьмем, напрыклад, Мытнічынскі вагонабудаўнічы завод. Там у наяўнасці ўсе адзнакі канцылярска-бюракратычнага метада кіраўніцтва заводам, функцыяналізма ў структуры апарата і раскіданне штатаў. У заводаўпраўленні ёсць 14 аддзелаў, у якіх працуе 367 чал. Апрача таго, у цэхах завода 234 служачых; да агульнай колькасці працуючых па заводзе 3.832 чалавек гэта складае 16 проц. Апрача дырэктара на заводзе ёсць нам. тэхнічнага дырэктара, нам. дырэктара па матэрыяльна-гаспадарчай частцы, нам. дырэктара па рабочаму снабжэнню, вытворчы аддзел, аддзел падрыхтоўкі вытворчасці, аддзел галоўнага механіка, аддзел тэхнічнага кантролю, планава-эканамічны аддзел, сектар кадраў, спецыяльны, кантроль выканання, цэнтральная бухгалтерыя, камерыйны аддзел, які пад раздзяляецца на фінансавы, пастаўчы і пасыльны, снабжэння і збыту, кіраўніцтва справамі, кадровы, аддзел капітальнага будаўніцтва, аддзел рабочага снабжэння.

ПРАЦЯГ ДАКЛАДА У НАСТУПНЫМ НУМАРЫ

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ

Упаўн. Галоўлітбела № К—2417

Менск, друкарня «Звязды»